ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ (з дарожным дадатнам „Прафрух“)
На 1 мес. . . — 80 к.
„ 3 мес. . . 2 р. 60 к.
„ 6 мес. . . 5 р. —
„ 12 мес. . . 9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ
За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., іншагароднія абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы даражэй. Гіры шматразовым друкаваньні—скідка. Звыш карыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. задатку.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „Зьвязда“ Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЇН, ЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Партсэкцтар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-80
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Адрэс падпіскі . 7-81
„ абвестак . . 7-81

АУТОРАК, 12 жніўня 1930 г.
№ 187 (3785)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА
МЕНСК, Савецкая, 63.

На праверку масам

Першая бальшавіцкая вясна дала бальшавіцкія тэмпы росту калектывізацыі і пасеўнае плошчы. Дасягненьні ў справе сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі зьяўляюцца рэзультатам шпаркага тэмпу разьвіцьця індустрыі, масавага разгортваньня калектывізацыі, пасаджэньня саўгасаў, паступленьня на каніталістычныя элемэнты вёскі, разгортваньня работы па арганізацыі беднаты і разгрому контр-рэвалюцыйнага трацкізму і правай апазыцыі. Гэтыя дасягненьні былі-б немагчымы, калі-б мільённыя масы на практыцы не пераканаліся, што па-старому жыць нельга, што буйная калектыўная гаспадарка выгадней, чым дробная індывідуальная гаспадарка. Гэтыя дасягненьні сталі магчымымі толькі таму, што рабочая кляса пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі ўвесь час умацоўвала саюз з серадняком, перакавала, пераконвала мільённыя масы бядняка-серадняцкага сялянства ў патрэбнасьці пераходу на сацыялістычны шлях разьвіцьця.

Сацыялістычнае будаўніцтва вёскі адбываецца ва ўмовах абвастрэньня клясавай барацьбы. На аснове зьяўляўшайся хвалі калектывізацыі кулаку нанесены руйнуючы ўдар. Мы-б ня здолелі правесьці нашу рэвалюцыйную работу ў вёсцы, калі-б ня мелі падтрыманьня мас. Мы моцны нашай сувязьзю з масамі, мы моцны нашым кіраўніцтвам масамі і на ўмацаваньне гэтай сувязі нельга шкадаваць сіл. Мы перамагаем у барацьбе з адсталымі формамі сельскае гаспадаркі таму, што разам з партыяй пад яе кіраўніцтвам барацьбу вядуць мільённыя масы пралетараў, беднаты і сераднякоў.

Сацыялістычная рэканструкцыя сельскае гаспадаркі натыкаецца на рад цяжкасьцяй. Ня ўсе знаходзяць у сабе сілы адразу парваць з мінулым. Патрэбна вялізарнейшая энэргія для таго, каб падцягнуць адстаўшых, пераканаць іх у жыцьцёвай неабходнасьці хутчэй пакончыць са старой індывідуальнай гаспадаркай. Гэта падцягваньне адстаючых, яшчэ не пераканаўшыхся ў пераважнасьці сацыялістычных форм сельскае гаспадаркі, зьявіцца адной з вялізарнейшых задач партыі. XVI зьезд партыі даў дырэктыву «не цкаваць індывідуальнікаў, а аказваць ім дапамогу і ўсімі спосабамі прыцягваць да калгасу». Ці выконваецца гэтая дырэктыва XVI зьезду партыі? На жаль, не заўсёды і ня ўсюды. З гэтым трэба пакончыць. Толькі контр-рэвалюцыйны трацкісты можа гаварыць аб тым, што нямінучы канфлікт паміж пралетарыятам і сялянствам, што ў калгасах яшчэ хутчэй пойдзе працэс дыфэрэнцыяцыі сялянства. Толькі мацёры правы апартуністы можа адстойваць тэорыю і практыку капітуляцыяй перад кулаком у пытаньнях аб тэмпах калектывізацыі, толькі апартуністы можа адмаўляць рашучы паварот серадняка да сацыялізму. **Некалгасьнік ня вораг, ён саюзьнік пралетарыяту.**

У нас ёсьць усе аб'ектыўныя прадпасылкі для магутнай хвалі калектывізацыі.

Асаблівую ўвагу зварачае зьезд на абсалютную недапушчальнасьць недаацэнкі існуючых у гэтых раёнах калгасаў толькі таму, што іх ёсьць вясной г. г. 7-8 проц. замест лічаных раней на паперы дзесяткаў процантаў. Зьезд лічыць недапушчальным ігнараваньнем гэтых калгасаў, маючы на ўвазе вопыт разьвіцьця калектывізацыі збожжавых раёнаў, дзе ў мінулым годзе лік калгасаў не перавышаў налічанага цяпер ліку калгасаў у спажываючай паласе і дзе гэта невялікая колькасьць калгасаў адыграла важнейшую ролю ў далейшым разгортваньні ўсяго калгаснага руху, паколькі ў асобе калгасаў ствараліся ўзоры і прыклады для ўсёй іншай сялянскай масы і ў іх выкаваліся кадры, якія сталі пры далейшым разгортваньні калгаснага руху арганізатарамі масавай калектывізацыі.

(З рэзалюцыі XVI зьезду УсеКП(б).

Мы падкрэсьліваем, што мы цяпер у Беларусі маем магчымасьць далейшага **разьвіцьця калектывізацыі,** «апіраючыся з данага моманту ня толькі на наш вопыт і нашы пераконаньні, але і на вопыт соцен тысяч калгасьнікаў, якія стануць лепшымі ініцыятарамі і арганізатарамі буйное гаспадаркі». (Якаўлеў). Трэба безадкладна ўзяцца за скарыстаньне вопыту соцен тысяч калгасьнікаў Беларусі. **Мы маем магчымасьць і патрэбныя формы цалкам скарыстаць рэзультаты першай бальшавіцкай вясны.**

Трэба, каб «вопыт і пераконаньні» калгасьнікаў сталі здабыткам усіх некалгасьнікаў.

Калгасы—на праверку масам—г. зн., што ўсе калгасы павінны безадкладна падрыхтавацца для таго, каб давесьці ўсім бедняком і серадняком некалгасьнікам свой вопыт і свае пераконаньні. Трэба падрабязна расказаць некалгасьнікам аб дасягненьнях калгасаў, аб пераважнасьцях калгасаў перад дробнай індывідуальнай гаспадаркай. Няхай некалгасьнікі пераканаюцца на практыцы ў пераважнасьцях буйной калектыўнай гаспадаркі. Калгасьнікі павінны скарыстаць гэту праверку іх дзейнасьці для таго, каб пераканаць некалгасьнікаў правесьці асеньнюю пасеўную кампанію разам па калектыўных пачатках. Значэньне такой праверкі некалгасьнікам, стан вынікаў першай пасеўнай кампаніі калгасам будзе ўдарам па ўсіх тых, хто хоча пасварыць калгасьнікаў з некалгасьнікамі. У першую чаргу гэты ўдар атрымае кулак і падкулачнік і іх агент унутры партыі правы апартуністы,—якія зацікаўлены ў антаганізьме паміж калгасьнікам і некалгасьнікам. Удар атрымае і сёнешні «левы» загібшчык, які ніяк ня можа, або ня хоча ўстанавіць правільныя ўзаемаадносіны паміж калгасьнікамі і некалгасьнікамі.

Гэтая масавая праверка павінна быць поўнасьцю скарыстана для падрыхтоўкі да асеньняй пасеўнай кампаніі, для рэалізацыі пастаноў аб жывёлагадоўлі і для лепшай арганізацыі ўборкі позьніх культур. Мы павінны скарыстаць гэту праверку—даклады калгасаў для таго, каб паказаць прыклад высокай сьвядомасьці калгасьнікаў у выкананьні іх абавязкаў перад дзяржавай у справе здачы хлеба дзяржаве—і гэта бязумоўна пацягне за сабой павялічэньне здачы хлеба і с.-г. сырцу некалгасьнікамі. Справаздачы калгасаў павінны быць таксама цалкам скарыстаны для ўзмацненьня разьмяшчэньня пазыкі «Пяцігодка—за чатыры гады».

Калгасы не павінны скрываць і свае недахопы. Бядняк, серадняк зможа правільна ацаніць прычыны недахопаў. Мы на гэтых сходах атрымаем парады, як хутчэй зьнішчыць гэтыя недахопы, як лепш іх выправіць. Такая масавая праверка будзе ўзорам бальшавіцкай самакрытыкі. Клясавы вораг бясспрэчна пастараецца скарыстаць справаздачы калгасаў для таго, каб зрабіць паклёп на калгасы. Калгасьнікі пры дапамозе беднякоў і сераднякоў некалгасьнікаў змогуць вывіць паклёп, дадуць адпаведны адпор разьюшаным клясавым ворагам. Справаздачы калгасаў павінны быць скарыстаны для яшчэ больш моцнага ўдару па кулаках і падкулачніках, для выкрыцьця ўсіх тых, хто шкодзіць калгасам знутры.

За падрыхтоўку да масавых справаздач калгасаў, трэба ўзяцца безадкладна, праводзіць яе трэба па гарачых сьлядох уборкі. Для правядзеньня іх павінны быць мабілізаваны ўсе калгасьнікі. Патрэбна вялікая падрыхтоўчая работа. Месцы бязумоўна праявяць сваю творчую ініцыятыву.

Справаздачная кампанія павінна быць цалкам скарыстана для папулярызацыі пастаноў XVI зьезду партыі, для растлумачэньня генэральнай лініі партыі, для мабілізацыі шырачайшых мас на яе ажыцьцяўленьне.

Гэта праверка паскорыць працэс масавай калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва, як клясы, на аснове суцэльнай калектывізацыі.

На праверку масам!

У краіне даляру

У Нью-Ёрку беспрацоўныя начуюць у вэстыбюлі народнай бібліятэкі.

РАЗГУЛУ ФАШЫЗМУ

РАБОЧЫЯ МАСЫ ПРОЦІПАСТАЎЛЯЮЦЬ адзіны антыфашысцкі фронт

Антыфашысцкая канфэрэнцыя

СТАКГОЛЬМ, 10. Адбылася скандынаўска - фінская **антыфашысцкая канфэрэнцыя.** На канфэрэнцыі прысутнічала 154 дэлегаты, з іх 12 з Нарвэгіі, 2 — з Даніі, 2 — з Фінляндыі (рэшта дэлегатаў ад шведзкіх рабочых). Пераважная большасьць дэлегатаў выбрана на прафсаюзных і заводзкіх сходах і зьяўляюцца прадстаўнікамі **50.000 рабочых.** Канфэрэнцыя гэта зьяўляецца першым крокам на шляху стварэньня **адзінага фронту зьнізу і кладзе пачатак арганізаванай барацьбе супроць фашызму.** На парадку дня канфэрэнцыі сталі пытаньні: барацьба супроць фашызму ў Скандынавіі і Фінляндыі, пяцігодка СССР і барацьба супроць імпэрыялістычнай вайны і арганізацыя дапамогі фінскім рэвалюцыянэрам.

У прынятай рэзалюцыі канфэрэнцыя адначае ўзрастаючы эканамічны крызіс у Скандынаўскіх краёх і, як вынік гэтага, — шпаркі рост фашызму. Наступленьне фашызму ў Фінляндыі робіць фашысцкую небясьпеку ў Скандынавіі асабліва рэальнай, у прыватнасьці ў Швэцыі. Канфэрэнцыя заклікае рабочых Скандынавіі да арганізацыі масавай барацьбы супроць фашызму шляхам стварэньня спэцыяльных камітэтаў і атрадаў рабочай самааабароны на прадпрыемствах. Дробных сялян і батракоў канфэрэнцыя заклікае да сумеснай з прамысловымі рабочымі барацьбы супроць фашызму. Для арганізацыйнага кіраўніцтва антыфашысцкай барацьбой у Швэцыі, Нарвэгіі і Даніі, канфэрэнцыя выбрала камітэт з 9 членаў. Камітэту даручана пасьлаць рабочую дэлегацыю ў Фінляндыю для вывучэньня становішча фінскіх рабочых. На нарадзе шведзкай дэлегацыі пастаноўлена **стварыць шведзкую сэкцыю МОПР'у.**

У ціскох § 48

БЭРЛІН, 10. На нацыяналістычным перадвыбарчым сходзе ў Потсдаме міністр Трэвіранус заявіў, што ўрад Брюнінга даў Гіндэнбургу абавязацельства абавязкова правесьці фінансавую рэформу. «Пры гэтым, — заявіў Трэвіранус, — мы ня спынімся перад тым, каб пусьціць у ход апарат парляманцкіх выбараў столькі раз, колькі будзе патрэбна». Такім чынам, Трэвіранус пацьвярджае, што ўрад буржуазнага блёку намеран назначыць выбары ў **рэйхстаг у другі раз,** калі ён 14-га верасьня не атрымае большасьці.

„Вылучэнцы“ фашызму

БЭРЛІН, 10. Для шпарка прагрэсуючай фашызацыі Нямеччыны надзвычай характэрна ўзрастаючая роля **ваенных ва ўсіх буржуазных палітычных партыях.** Так, народная партыя высунула ў Магдэбургскай акрузе ў якасьці свайго галоўнага кандыдата да выбараў у рэйхстаг генэрала Сэкта. Сэкт адыграў вялікую ролю для ўмацаваньня дыктатуры капіталу ў Нямеччыне. У 1923 годзе, калі пасьля гамбургскага паўстаньня тагочасны прэзыдэнт сацыял-дэмакрат Эбэрт скасаваў канстытуцыю і ўвёў у дзейнасьць 48 параграф, Сэкту была прадастаўлена ўся выканаўчая ваенна - палітычная паліцэйская ўлада.

Надаўна Сэкт выпусьціў кнігу пра армію, у якой распрацавана пытаньне аб ролі армії ў барацьбе з унутраным ворагам. Народна - кансэрватыўная партыя высунула кандыдатамі міністра Трэвірануса Моа — марскога афіцэра і Лётэ Фэрбэка, які ў імпэрыялістычную вайну камандаваў нямецкімі калёніяльнымі войскамі. Фашыстыя высунулі сваім кандыдатам генэрала Эппа; дзяржаўная партыя, якая панава ўтварылася, — афіцэра рэйхсвэру Маруана. У сьпісе партыі нацыяналістых таксама ёсьць імёны некалькіх выдатных ваенных.

Хваля сялянскіх выступленьняў

ВЕНА. Паводле паведамленьняў з Бухарэсту, **сялянскія хваляваньні ў Румыніі перакінуліся на вобласьці, якія населены нацменшасьцямі.** За апошнія дні сур'ёзныя хваляваньні адбыліся каля павету Адахрэй у Трансільваніі, населеным вэнгерскімі сялянамі, якія знаходзяцца ў вялікай запазычанасьці мясцовым банкам і абцяжараны непасільнымі падаткамі. Адбыўся цэлы рад сялянскіх сходаў, якія прайшлі ў абстаноўцы абурэньня. У горадзе Адахрэй гэтымі днямі сабраліся сяляне акалёных вёсак і **правялі бурную дэманстрацыю, разграміўшы ў горадзе банкі.** Жандармерыя не магла падавіць дэманстрацыю і была вымушана затрабаваць падмогу. Адбылася бойка паміж жандармэрыяй і сялянамі. Зроблены масавыя арышты. Абурэньне панае сярод сельска-гаспадарчых рабочых.

У раёне Балат на граніцы Югаславіі ахранка шукаючы камуністых, арыштавала вельмі многа людзей у вёсках і на гарадзкіх прадпрыемствах.

Пад знакам жорсткага тэрору

ГЕЛЬСІНГФОРС. Перадвыбарная кампанія ў сойм адбываецца **пад знакам жорсткага фашысцкага тэрору.** Буржуазныя партыі выступаюць адзіным фронтам пад фашысцкімі лёзунгамі. Рабочыя, дробныя зямляўласьнікі, дзе-чы левага руху сотнямі пазбаўляюцца выбарчых правоў, гвалтам выдаляюцца з выбарчых камітэтаў. У цыркуляры фашысцкага саюзу франтавікоў зазначаецца, што саюз будзе сачыць, каб кандыдатамі ў сойм высоўваліся толькі асобы, якія падтрымліваюць рух і мэты саюзу.

Напярэдадні V Кангрэсу Прафінтэрну

Прадстаўнік мэталістых БССР

абраны на Кангрэс

Тав. Яфімаў, Сямён Яфімавіч, рабочы віцебскага заводу «Чырвоны Мэталіст», абраны агульным сходам рабочых **на V кангрэс Прафінтэрну.** Рабочы стаж 33 гады. Спэцыяльнасьць—калільшчык. На заводзе працуе з 1924 году, член партыі з 1921 году. Член АКК і ЦКК другога скліканьня. Ударнік.

Рэвалюцыйныя рабочыя абіраюць дэлегатаў

ВЕНА, 10. Адбылася канфэрэнцыя рабочай моладзі, якая належыць да рэвалюцыйнай прафінтэрны. **На канфэрэнцыі выбраны два дэлегаты на V кангрэс Прафінтэрну.**

БЭРЛІН, 10. Паводле паведамленьняў з Швэйцарыі, па ўсім краі адбываюцца выбары дэлегацыі на V кангрэс Прафінтэрну. У Шатгаўзэне адбыўся масавы сход рабочых, на якім дэлегатам быў выбран рабочы-мэталіст з буйнога мэталюргічнага заводу. Цырыкскія рэвалюцыйныя саюзы дэлегуюць на кангрэс работніцу гарбарні. У Лазане дэлегатам ад рабочых францускай Швэйцарыі выбран будаўнік.

Італьянская канфэдэрацыя працы далучаецца да Прафінтэрну

ПАРЫЖ, 8. Выканком італьянскай канфэдэрацыі працы публікуе ў органе францускай унітарнай канфэдэрацыі працы «Ві. Уврыер» адозву да ўсіх рабочых—італьянскіх эмігрантаў. У гэтай адозве італьянская канфэдэрацыя працы паведамляе аб сваёй пастанове далучыцца да Прафінтэрну.

Далей у адозве паведамляецца, што рэвалюцыйныя італьянскія рабочыя, якія далучаюцца да італьянскае канфэдэрацыі працы, у самых цяжкіх умовах падпольнай работы змагалі захаваць сваю прафсаюзную арганізацыю. Зварот у Прафінтэрн рэвалюцыйных прафсаюзаў Італіі, які адбыўся паводле волі і ўхвалы італьянскага пралетарыяту, паслужыць пачаткам для пераможнага аднаўленьня магутнасьці італьянскага рабочага руху.

Адозва паведамляе аб тым, што на шматлікіх падпольных сходах членаў рэвалюцыйных прафсаюзаў Італіі пастаноўлена пасьлаць дэлегацыю на пяты кангрэс Прафінтэрну.

Орган францускай канфэдэрацыі працы «Ві. Уврыер», падкрэсьліваючы ўсё значэньне пастановы выканкому італьянскай канфэдэрацыі працы, напамінае, што ў 1921 г. рэвалюцыйныя прафсаюзы Італіі былі захоплены рэфармістымі, якія, парушыўшы пастановы прафсаюзнага зьезду ў Ліварна аб бясспрэчным удзеле ў стварэньні Прафінтэрну, радам манэўраў дабіліся захаваньня італьянскай канфэдэрацыі працы ў рамках Амстэрдамскага Інтэрнацыяналу. «Далейшая гісторыя бясконцых здрадніцтваў Амстэрдаму,—піша газэта,—яго афіцыйная сувязь з фашызмам, з аднаго боку і рэвалюцыянізаваньне рабочых мас Італіі і іх прафэсыянальнага руху з другога, прывялі да цяперашняй пастановы аб далучэньні да Чырвонага Прафінтэрну».

Здань галоднай сьмерці вісіць над мільёнамі

Паводле атрыманых с.-г. управай Амэрыкі вестках, ДА 18.000 ТЫС. СЕМ'ЯЎ У АДНЭЙ З АКРУГ ШТАТУ КЕНТУКІ ЗНАХОДЗЯЦЦА НАПЯРЭДАДНІ ГОЛАДУ, БО ПАСЕВЫ ЗАГІНУЛІ, А ЖЫВЁЛА НЯ МАЕ КОРМУ.

Пралетарскае абурэньне супроць антыпралетарскай выхадкі

Група амэрыканцаў на Сталінградзкім трактарным заводзе зьбіла рабочага-нэгра

Ва ўчарашнім нумары газэты «Труд» паведамляецца аб барбарскім, антыпралетарскім, зусім нязвычайным у савецкіх умовах учынку. У СТАЛІНГРАДЗЕ НА ТРАКТАРНЫМ ЗАВОДЗЕ, ГРУПА АМЭРЫКАНСКІХ РЭАКЦЫЙНА НАСТРОЕННЫХ РАБОЧЫХ ЗБІЛА РАБОЧАГА-НЭГРА, ЯКІ ЗАЙШОЎ У СТАЛОЎКУ, І ВЫКІНУЛА ЯГО НА ВУЛІЦУ ТОЛЬКІ ЗАТОЕ, ШТО ЁН НЭГР.

У «асьвечанай», «свабоднай» Амэрыцы, дзе да гэтага часу існуе суд Лінча, (забойства нэграў бяз суду і сьледзтва), такі выпадак зьяўляецца звычайнай гісторыяй. Але ня звычайны і недапушчальны ў нас, у краі саветаў, у сацыялістычнай бацькаўшчыне працоўных усяго сьвету, дзе роўныя і нэгры і белыя.

Рабочыя трактарнага заводу, якія сабраліся, як паведамляе «Труд», на сваім мітынгу, пастанавілі «ПРЫПОМНІЦЬ ТЫМ ТАВАРЫШОМ, ЯКІЯ ГЭТАГА НЕ РАЗУМЕЮЦЬ, ШТО МЫ НЕ ДАПУСЬЦІМ У СССР МАРАЛІ БУРЖУАЗНАЙ АМЭРЫКІ!».

У рабочых Савецкага Саюзу, ва ўсей рабочай грамадзкасьці, гэты антыпралетарскі ўчынак групы адсталых амэрыканскіх рабочых ВЫКЛІКАЎ ВЯЛІЗАРНАЕ АБУРЭНЬНЕ.

ЗРУХУ НЯМА

ПАДРЫХТОЎКА ДА АСЕНЬНЯЙ СЯЎБЫ НЕ РАЗГОРНУТА

БЕЗ ПЕРАМЕН

У падрыхтоўцы да асеньняй сяўбы няма ніякага зруху. Весткі з месц, якія паступаюць у рэдакцыю, гавораць, што да гэтага часу савецкая грамадзкасьць і амаль усе нізавыя (і ня толькі нізавыя) арганізацыі праходзяць міма гэтай важнейшай палітычнай кампаніі.

Характэрна, што наш акруговы друк зусім не зварачае ўвагі на сяўбу. Мы пераглядзелі газэты за апошнюю дэкаду, і амаль ва ўсіх, за рэдкімі выключэньнямі, няма ні слова аб асеньняй кампаніі. Бабруйскі **«Камуніст»** абмежаваўся заметкай аб значэньні вапнаваньня, гомельская **«Полесская Правда»** маленькай карэспандэнцыяй пра абмеркаваньне пасеўных плянаў у адным сельсавеце, **«Віцебскі Пралетарый»**—артыкулам агульнага характару і дзьвюма-трыма заметкамі. І гэта ўсё. Як-жа месцы рыхтуюцца да сяўбы? Ці прыведзен інвэнтар у баявую гатоўнасьць? Ці распрацаваны пасеўныя пляны, ці абмяркоўваліся яны калгасьнікамі і індывідуальнікамі? На гэтыя пытаньні мы не знаходзім адказу. Газэты маўчаць.

Бязумоўна, што наш друк сваім маўчаньнем адбівае слабы, недапушчальна марудны тэмп работы на мясцох. Карэспандэнцыі нашых брыгадзіраў пацьвярджаюць гэта.

Паслухайце.

У Смалявіцкім раёне ні адзін калгас ня рыхтуецца да сяўбы. Панае саманёк. Пасеўныя пляны не даведзены да калгасаў і сельсавету. Вапнаваньне і тарфаваньне сарвана. Не выкарыстана 70 тон фасфарытнай мукі. Ні акрпаляводсаюз, ні акрзаг, ні акркалгассаюз нічога не зрабіў для забесьпячэньня раёну машынамі.

У Крычаўскім раёне (Магілеўшчына) у водпуску знаходзяцца загадчык земаддзелам, старшыня і сакратар райвыканкому, старшыня райкалгасаюзу. Хто-ж кіруе сяўбой?

У Аршанскай акрузе пасеўныя пляны павінны былі быць даведзены да калгасу і двара да канца чэрвеня. Прайшло больш месяца пасьля гэтага тэрміну, а зроблена вельмі мала. Да гэтага часу ў большасьці раёнаў ні калгасьнікі, ні сяляне ня ведаюць сваіх плянаў. Некаторыя раёны толькі ў ліпені склалі і распрацавалі ра-

Вельмі дрэнна з вапнаваньнем глебы. Міркуючы па паведамленьнях з многіх раёнаў, правядзеньне гэтага прасьцейшага і ў той-жа час надзвычай важнага агранамічнага мерапрыемства—пад сур'ёзнай пагрозай. Многія калгасы адмаўляюцца ад мінэральнага ўгнаеньня. У Рэчыцы валяюцца 80 вагонаў (!) вапны, але ніхто іх ня хоча браць. У Аршаншчыне такі-ж малюнак. Усе млыны перагружаны загатоўленай вапнай. Некаторыя з іх, калі ня будуць прыняты неадкладныя меры, вымушаны будуць спыніць работу, бо ім няма куды дзяваць прадукцыю.

У многіх партыйных дакумантах ня раз падкрэсьлівалася вялізарнае значэньне першапачатковых вытворчых таварыстваў. Між тым, работа па арганізацыі гэтых таварыстваў, глыбока важная ва ўмовах БССР, вядзецца нездавальняюча. Карэспандэнцыя з Прапойскага раёну, якая зьмяшчаецца ніжэй, вельмі паказальна. Тут распрацавалі падрабязныя пляны, намецілі шырокую сетку прасьцейшых аб'яднаньняў і гэтым... абмежаваліся.

Забылі, што адных плянаў мала, што патрэбна вялікая, упартая арганізацыйная і агітацыйная работа па ажыцьцяўленьні гэтых плянаў. Пляны засталіся плянамі. Амаль ні адно таварыства па сёнешні дзень не арганізавана.

Нарада па пытаньні аб ліквідацыі округ, якая нядаўна адбылася, яшчэ раз падкрэсьліла, што ліквідацыя акруговых устаноў ніякім чынам не павінна адбівацца на ходзе чарговых важнейшых гаспадарча - палітычных кампаній. Гэта новае папярэджаньне аказалася вельмі своечасовым. У гэтым рэдакцыі прышлося ўчора пераканацца. Нам патрэбны былі даныя аб падрыхтоўцы да сяўбы некаторых раёнаў Менскай акругі. Зьвярнуліся ў акрэмаддзел. Аказалася, што да 25-га ліпеня ён быў ліквідаваны. Зьвярнуліся ў Наркамзем. Але і тут мы не маглі атрымаць даных аб перадпасеўнай рабоце ў раёнах.

Шмат якія арганізацыі тлумачаць слабы ход падрыхтоўкі да сяўбы тым, што на мясцох заняты ўборкай, што няма магчымасьці адначасова праводзіць дзьве кампаніі. Гэта вельмі дрэнныя апраўданьні. Уборка і сяўба цесна зьвязаны паміж сабою, выпікаюць адна з аднэй. У ўборку і сяўбу трэба праводзіць баявымі ўдарнымі тэмпамі.

На пасеўным фронце **ня ўсё добра.** Пералому яшчэ няма. **Яго трэба дабіцца ў бліжэйшыя дні.**

6 новых арцеляй—вынік бальшавіцкай уборкі

Калгасы Касьцюковіцкага раёну ўбралі 95 проц. азімых пасеваў і 80 проц. ячменю

КАСЬЦЮКОВІЧЫ, 10. (Ад нашага карэспандэнта). КАЛГАСЫ **КАСЬЦЮКОВІЦКАГА** РАЁНУ З ПОСЬПЕХАМ КАНЧАЮЦЬ УБОРКУ УРАДЖАЮ. ДА 5-га ЖНІЎНЯ КАЛГАСЫ УБРАЛІ 95 ПРОЦ. АЗІМЫХ ПАСЕВАЎ І 80 ПРОЦ. ЯЧМЕНЮ. СЕНАЖАЦЬ ПОЎНАСЬЦЮ СКОШАНА І УБРАНА. 42 КАЛГАСЫ (УСЯГО У РАЁНЕ ЁСЬЦЬ 49 КАЛГАСАЎ) УРАДЖАЙ УБРАЛІ ПОЎНАСЬЦЮ І ПРЫСТУПІЛІ ДА АБМАЛОТУ. ВАРТА АДЗНАЧЫЦЬ УДАРНУЮ РАБОТУ КАМУНЫ **«ЗЬВЯЗДА»** І КАЛГАСУ **«ПАРЫСКАЯ КАМУНА».**

У КАМУНЕ «ЗЬВЯЗДА» НЕ ХАПАЛА ШМАТ РАБОЧАЙ СІЛЫ. НЯ ГЛЕДЗЯЧЫ НА ГЭТА, КАМУНАРЫ ШЫРОКА РАЗГОРТВАЮЧЫ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА, ПОЎНАСЬЦЮ СВАЯЧАСОВА УБРАЛІ УСЕ ПАСЕВЫ АЗІМЫХ І ЯРАВЫХ. У КАМУНЕ АРГАНІЗАВАНА 10 УДАРНЫХ БРЫГАД, ЯКІЯ ЯДНАЮЦЬ 150 КАМУНАРАЎ. БРЫГАДЫ КАМУНАРАЎ УЗЯЛІ НА БУКСІР БУХАРА-ПРАЛЕТАРСКУЮ КАМУНУ, ЯКАЯ АДСТАЕ ВА ЎБОРЦЫ. КАЛГАС «ПАРЫСКАЯ КАМУНА» ТАКСАМА СКОНЧЫЎ НА ЎСЕ 100 ПРОЦ. УБОРКУ ЖЫТА, ЯЧМЕНЮ І СЕНАЖАЦІ.

УДАРНАЯ ЎБОРКА ЎРАДЖАЮ ВЫКЛІКАЛА НОВЫ ПРЫЛІЎ У КАЛГАСЫ. ЗА ЧАС УБОРКІ Ў КАЛГАСЫ КАСЬЦЮКОВІЦКАГА РАЁНУ ЎСТУПІЛА КАЛЯ 100 БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК. АДНАЧАСОВА Ў РАЁНЕ АРГАНІЗАВАЛАСЯ 6 НОВЫХ АРЦЕЛЯЙ: **«ЧЫРВОНЫ ШТАНДАРТ», «ІСКРА», «ПРАЎДА», «КАМУНІСТ», «СЯЛЯНКА» І «ЗАВЕТ ІЛЬЛІЧА».**

„Вестак няма“ Калі-ж яны будуць?

Цэнтральны Камітэт ЛКСМБ занесены газэтай «КОМСОМОЛЬСКАЯ ПРАВДА» на чорную дошку за непрадстаўленьне вестак па сіласаваньні. З таго часу як «Комсомольская Правда» занесла ЦК ЛКСМБ на чорную дошку мінула ўжо каля тыдня. Відавочна, што ЦК ЛКСМБ меў даволі часу, каб ужыць адпаведныя энэргічныя меры і зьняць слабе з чорнай дошкі. Рэдакцыя «Зьвязды» учора паслала свайго супрацоўніка ў ЦК ЛКСМБ, каб высьвятліць, у якім становішчы зараз знаходзіцца гэта справа.

На запытаньне нам. сакратара ЦК ЛКСМБ т. РЫНДЗІЧУ—што зроблена ЦК ЛКСМБ каб зьняць слабе з чорнай дошкі і як паступаюць весткі па сіласаваньні,—наш супрацоўнік атрымаў адказ:

— Ідзеце ў Наркамзем. Там вы ўсё атрымаеце. У мяне вестак няма.

Халі-ж, нарэшце, будуць весткі, якія адлюструюць работу камсамолу Беларусі ў справе сіласаваньня? Няўжо-ж ЦК ЛКСМБ ня хоча зьняць слабе з чорнай дошкі?

Ц.

На мяжы двух міроў

ПОЛАЦАК, 11. (Ад нашага карэспандэнта). Уборачная кампанія ў Дрысенскім раёне набліжаецца к канцу. Ня гледзячы на кепскае надвор'е, у раёне сенажаць ужо поўнасьцю ўбрана. Многія калгасы, убраўшы ўраджай, прыступілі да малацьбы. Вялікую дапамогу калгасам ва ўборачнай кампаніі аказалі прафсаюзныя арганізацыі і ваенныя часьці. У раёне было праведзена **27** суботнікаў дапамогі маламоцным калгасам ва ўборцы ўраджаю.

Падрыхтоўка да асеньняй сяўбы ў асноўным ідзе добра. Глеба для асеньняй сяўбы амаль падрыхтавана. Мясцовая трактарная калёна працуе з поўнай нагрузкай. Калі калёны пачалі ўзорваць зямлю камуны **«Верны Шлях»,** якая знаходзіцца на беразе **Заходняй Дзьвіны,** дык на польскім беразе сабралася ўсё мястэчка ад малога да старога глядзець, як працуюць стальныя коні. Прайшло некалькі хвілін і польскія паліцэйскія разагналі натоўп.

У раёне да сёнешняга дня **ня ведаюць,** калі будзе завезена чыстагатунковае насеньне. Гэта дэзарыентуе мясцовых работнікаў і тармазіць тэмпы падрыхтоўкі да асеньняй пасеўнай кампаніі. За апошні час у калгасы ўступіла каля 50 індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

КУРГАН.

НА БУКСІР ЯГО

Клічаўскі раён правальвае ўборку і ня рыхтуецца да сяўбы

КЛІЧАЎ, 11. Зусім слаба праходзіць уборачная кампанія ў Клічаўскім раёне. Калгасы ганебна адсталі ва ўборцы ўраджаю. У раёне няма жнівярак, што, бязумоўна, тармозіць уборачную кампанію. Яшчэ ў чэрвені з Рагачова павінны былі прыбыць у Клічаў 5 жнівярак. Аднак, на станцыі Магілеў чыгуначныя бюракраты пераблыталі адрасы, і накіравалі жнівяркі магілеўскаму акрпаляводсаюзу. Раён застаўся зусім без жнівярак. Між тым, жыта пачало асыпацца. Да асеньняй пасеўнай кампаніі ў раёне ніхто **ня рыхтуецца.**

Пляны і сапраўднасьць

У Прапойску ў сувязі з асеньняй пасеўнай кампаніяй распрацаваны дакладны плян арганізацыі пасялковых і вытворчых таварыстваў. Прапойскі райвыканком намеціў арганізаваць 12 пасялковых таварыстваў, 29 мэтіярацыйных, 20 машынных і г. д. Прэзыдыум РВК, ухваліўшы плян, паставіў кропку.

Вакол гэтага пытаньня ня створана грамадзкая думка, не праводзіцца растлумачальная работа. Сярод бядняцка-серадняцкіх мас задачы арганізацыі першапачатковых таварыстваў не растлумачаны. У выніку, у раёне яшчэ не арганізавана амаль ні аднаго таварыства. Прыгожы плян райвыканкому застаўся простай паперкай.

Л. Б.

Уборка буракоў—ударная кампанія

5.000 рабочых—павінна мабілізаваць БССР

МАСКВА, 11. Калегія Наркампрацы СССР абмеркавала пытаньне аб забесьпячэньні рабочай сілай кампаніі па ўборцы буракоў. Кампанія па ўборцы цукровых буракоў набывае ў гэтым годзе выключнае значэньне.

Збор буракоў перавысіць даваенны на 35-40 проц., а леташні на 29 проц. Наркампрацы пастанавіў абвясьціць работу па прыцягненьні рабочай сілы на ўборку буракоў ударнай. **Апарат аддзелаў і бірж працы і с.-г. інспэктароў для набору рабсілы лічыцца мабілізаваным.**

Наркампрацы РСФСР павінен падрыхтаваць рэзэрв на Паўночным Каўказе у 10.000 рабочых, **а Наркампрацы БССР—5.000 рабочых.** У выпадку патрэбнасьці Наркампрацы Саюзу пастанавіў узбудзіць перад Наркамваенморам хадайніцтва аб дапамозе саўгасам і калгасам чырвонаармейскіх часьцей ва ўборцы і перавозцы буракоў. Калгасцэнтру прапанавана даць на месцы катэгарычную дырэктыву аб поўным выкананьні ўзятых на сябе абавязацельстваў па пастаўцы для саўгасаў рабочай і гужавой сілы.

КАЛГАСЬНІК!
НАВЕДВАЮЧЫ ВЫСТАЎКУ,
**карыстайся 25%

Партыйнае будаўніцтва

УЗЬНЯЦЬ МАСЫ ПРАЦОЎНЫХ ЖАНЧЫН НА БАРАЦЬБУ За ВЫСОКІЯ ТЭМПЫ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА

„З рэарганізацыяй партапарату уся партарганізацыя па вінна клапаціцца аб абслугоўваньні жанчын, аб рабоце сярод жанчын, аб вярбоўцы жанчын у партыю“

(З дакладу тав. КАГАНОВІЧА на XVI зьезьдзе УсеКП(б)

За бальшавіцкі размах у рабоце

XVI зьезд УсеКП(б) абавязаў усе партыйныя арганізацыі ўзмоніць сваю работу па мабілізацыі шырокіх мас працоўных жанчын гораду і вёскі па выкананьне задач па сацыялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі.

Гэта ўмацаваньне работы сярод працоўных жанчын на вытворчасьці перш за ўсё павінна найсьці па лініі мабілізацыі мас рабочых вакол пытаньняў найбольш актуальных для дanalга этапу сацыялістычнага будаўніцтва. Цэнтральнымі пытаньнямі ў рабоце сярод жанчын павінны зьявіцца асноўныя пытаньні, узьнятыя XVI зьездам УсеКП(б). Выкананьне пяцігадовага плану за 4 гады, узмацненьне і далейшае павышэньне тэмпаў разьвіцьця сацыялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі, наляпшэньня якасьці прадукцыі (выкананьне прамфінпляну на даным прадпрыемстве, барацьба з бракам, з прагуламі і г. д.), зьніжэньне сабекошту — вось у асноўным тыя пытаньні вакол якіх павінна быць мабілізавана актыўнасьць работніц.

Сярод работніц па фабрыках і заводах разгортваецца сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва. Перад партыйнымі арганізацыямі, перад іх сэктарамі па рабоце сярод жанчын адчыняецца вялізнае поле дзейнасьці, іменна, ў гаспадарчай галіне, якая павінна зьявіцца цэнтральным месцам у рабоце сярод жанчын на вытворчасьці. Ад гэтай задачы ня трэба адхіляцца, ёй павінны быць падначалены ўсе іншыя задачы. Пытаньні бытавой работы, якія ў мінулым шмат дзе займалі асноўнае месца ў рабоце, павінны быць падначалены памянёным вышэй задачам. Аднак, гэта ня значыць, што імі ня трэба займацца, што бытавыя пытаньні можна выкрасьліць з сферы работы сярод жанчын.

Падрыхтоўка кадраў з работніц, іх кваліфікацыя, пасылка работніц у навучальныя ўстановы павінна ў агульнай сыстэме работы сярод жанчын заняць адно з відных месц. Бо той процант, які складаюць работніцы ў навучальных установах, вельмі нізкі і ві ў якім разе не адпавядае тым задачам, якія ў гэтым кірунку пастаўлены партыяй.

Работа сярод калгасьніц павінна адбывацца ў такім-жа кірунку. Калгасьніцы невыстарчальна ўцягнуты ўпоўне ў работу па кіраўніцтве гаспадарчым жыцьцём калгасаў. Гэта акалічнасьць патрабуе ўзмоцненай работы парт'ячэек па актывізацыі шырокіх мас калгасьніц. Праз арганізацыю дэлегацкіх сходаў у калгасах, праз вытворчыя нарады, праз усе віды культурна - масавай работы калгасьніцы павінны настойліва ўцягвацца ў работу па выраўнаньню пытаньняў гаспадарчага парадку ў калгасе, па кіраўніцтве калгасам.

Пытаньні, якія ставяцца на дэлегацкіх сходах, павінны быць шчыльна ўвязаны з момантамі практычнай работы, правядзеньне ў жыцьцё якіх будзе служыць довадам узросшай актыўнасьці мас работніц і калгасьніц. У асобе дэлегатак - работніц трэба трымаць лепшых ударніц, ініцыятыўных і перадавых работніц, якія прымаюць актыўны ўдзел у сацспаборніцтве. У асобе дэлегатак калгасьніц мы павінны мець перадавікоў у справе мэтазгоднага скарыстаньня жаночай працы ў калгасе. Мабілізацыя калгасьніц на разьвіцьцё высока - прадукцыйных галін сельскай гаспадаркі, мабілізацыя калгасьніц на лепшае правядзеньне ўборачных, насеўных, хлебазагатоўчых і інш. кампаній павінна быць галоўным момантам у рабоце сярод калгасьніц.

Разьвіцьцё калгаснага руху вымагае лепшай пастаноўкі работы партыйных ячэек сярод батрачак, беднячак і середнячак, якія яшчэ не ў калгасах. І на гэтую частку, з гэтай часткай працоўных жанчын парт'ячэйкі павінны паставіць работу куды лепш, чым яна стаяла да гэтага часу.

Ва ўсёй рабоце сярод жанчын, як у горадзе, так і на вёсцы патрэбны бальшавіцкая сьмеласьць і размах, каб сапраўды накіраваць актыўнасьць жаночых працоўных мас на справу будаўніцтва сацыялізму.

У стане застою

(Віцебская акруга)

Работа партыйных арганізацый сярод працоўных жанчын у рэканструкцыйны пэрыяд як на фабрыцы і заводзе, так і ў саўгасе, калгасе і ў масах бяднячак і середнячак, якія яшчэ засталіся на-за калгасам, набывае асаблівае важнае значэньне. Гэту ісьціну, на вялікі жаль, усьвядомілі ня ўсе партыйныя ячэйкі і арганізацыі.

Сіроцінская райпартарганізацыя, яе асобныя ячэйкі наперакор партыйным дырэктывам, якія ў свой час даддены па пытаньнях работы сярод жанчын, не перабудаваліся, з тым, каб як мага лепш паставіць работу дэлегацкіх сходаў, актывізаваць шырокія масы калгасьніц батрачак, беднячак і середнячак.

Работа на дэлегацкіх сходах у застоі. Актыву працоўных жанчын ня ўцягнуты ў работу савецкіх і каапэрацыйных арганізацый і ўстаноў. Ня лепш абстаіць справа з разгортваньнем работы сярод калгасьніц.

У Высачанскім раёне ў некаторых мясцох работа парт'ячэек сярод жанчын таксама пастаўлена вельмі дрэнна. У Выдрэйскім сельсавеце парт'ячэйка ня здолела аханіць сваёй работай масы бяднячак і середнячак. Затое кулацкія, варожыя элэмэнты, выкарыстоўваючы бязьдзейнасьць ячэйкі на гэтым вучастку, вядуць антысавецкую агітацыю сярод жанчын. І часамі жанчыны падда-валіся на кулацкую агітацыю, выступалі супроць калектывізацыі.

Дэлегацкія сходы ў раёне працуюць слаба, не абмяркоўваюць пытаньняў і мерапрыемстваў, накіраваных на ўзмацненьне гаспадарчага становішча калгасаў.

Партыйныя ячэйкі павінны неадкладна ўзяцца за ноўнае выкананьне партыйных дырэктыў, павінны ўзяцца за ўсямернае наладжваньне работы сярод працоўных жанчын.

А. Д-скі.

Забыты вучастак

(Барысаў)

На фабрыцы **«Чырвоная Барэзіна»** і **«Пралетарская Перамога»** за апошні час прынята шмат новых рабочых, 80 проц. якіх складаюць жанчыны. Новыя работніцы ў асноўнай сваёй масе — былыя хатнія работніцы. Гэта павінна было ўсклясьці абавязак на партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі фабрык больш узмацніць палітыка-масавую і культурна - выхаваўчую работу сярод жанчын. Зараз на гэтых фабрыках працуе каля 1.500 жанчын, сярод якіх амаль што ніякай работы не дзецца. Калі на фабрыках былі жанарганізатары, то сякая-такая работа вялася, а зараз з часу арганізацыі сэктароў, жанработа заняпала. Дэлегацкія сходы зусім не працуюць. На пытаньне вылучэньня жанчын на кіруючую работу, партарганізацыя не зьвярнула як сьлед увагі, не вядзецца работа па падрыхтоўцы кадраў для вылучэньня. За апошні год з 1.500 жанчын усяго высунута 28 работніц у той час, калі патрэбнасьць у вылучэньках была большай. Кіраўнікі партыйных і прафэсыянальных арганізацый гавораць, што няма каго вылучаць, няма актыву, а самі нічога не зрабілі для яго стварэньня. У буйнейшым каробка-тыкеровачным цэху, дзе працуе 98 проц. жанчын, старшынёй пэхпрафбюро зьяўляецца мужчына. Нават і на такую работу кіраўнікі партарганізацый не палічылі патрэбным вылучыць жанчыну.

Партарганізацыя вельмі мала зрабіла па ўцягненьні жанчын у партыю. Ня гледзячы на тое, што на фабрыцы працуе, больш процант жанчын, чым мужчын, праслойка жанчын у партарганізацыі складае ўсяго 35 проц. Кіраўнікі партарганізацыі няўважліва адносяцца да вылучэньня жанчын. Калі актыўнейшая работніца, член бюро ЦК ЛКСМБ Ханіна была вылучана на работу ў фабком у якасьці культурніка, то кіраўнікі фабкому замест дапамогі у рабоце, усіляк яе ігнаравалі.

Кіраўнікі партыйнай арганізацыі стварылі такія ўмовы работы для Ханінай, што яна вымушана была зьвярнуцца ў райком партыі з просьбай накіраваць яе на іншую работу.

На фабрыцы за апошні час наглядаецца цякучасьць рабочай сілы, асабліва сярод жанчын - каробачніц. Партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі ня прынялі патрэбных мер для правядзеньня адпаведнай работы, каб спыніць гэту цякучасьць.

Ф—ко.

Аб становішчы Сьмілаўскай партарганізацыі

Пастанова бюро Менскага акругкому КП(б)Б ад 9-VIII 30 г.

Заслухаўшы даклад сакратара РК тав **Строма** і судакладчыка тав. **Бягуна** аб становішчы Сьмілаўскай партарганізацыі, бюро АК лічыць, што:

1. Пры правільным ажыцьцяўленьні генэральнае лініі партыі Сьмілавіцкай партарганізацыяй і РК КП(б)Б, пры здаровым, у асноўным, становішчы раённай партарганізацыі, асобныя камуністы Сьмілавіцкай і Дукорскай ячэйкі КП(б)Б дапусьцілі скрыўленьне лініі партыі і бытавое разлажэньне, якое выявілася:

а) У перавыкладаньні індывідуальным падаткам середняку, запіску самакрытыкі і ганеньні на селькора Піскуна з боку сакратара парт'ячэйкі Валчэцкага; парушэньні савецкай дэмакратыі пры перавыбарах праўленьня калгасу «Беларуская Вёска»; праяўленьні правага апартунізму на практыцы ў час адліву калгасьнікаў з калгасаў; ігнараваньні выдучэнцаў; грубых сыстэматычных адміністрацыйных выпадках старшыні сельсавету **Дудкі** і злоўжываньні з боку апошняга пры распасюджваньні 3-й пазыкі індустрыялізацыі (прысваеньне сабраных грошай) на Дукорскай ячэйцы КП(б)Б.

б) У сыстэматычным п'янстве і палавой распусьце асобных раённых і сельскіх работнікаў, сувязь з чужым элэмэнтам на Сьмілаўскай ячэйцы КП(б)Б.

в) Усе гэтыя зьявішчы не знайшлі своячасовага ацэньленьня і прынцыпіальнага захаду да адхараўленьня Дукорскай і Сьмілаўскай парт'ячэек з боку РК КП(б)Б.

Выходзячы з гэтага, бюро АК прапануе:

1. РК КП(б)Б вызначыць рад канкрэтных мерапрыемстваў і мабілізаваць усю раённую партарганізацыю на барацьбу з антысавецкімі перагібамі, заціскам самакрытыкі, ганеньнем на селькора, на ноўнае разгортваньне ўнутры - партыйнай і савецкай дэмакратыі і выкрыцьцё ўсіх хворых зьяўішч, якія мелі месца ў Дукорскай і Сьмілаўскай парт'ячэйках, сканцэнтраваўшы ўвагу ўсёй партарганізацыі на пасяніховым выкананьні дырэктыў XVI і XIII зьездаў УсеКП(б) і КП(б)Б.

2. Склікаць раённую нараду селькораў, на якой завастрыць пытаньне аб выпадках скрыўленьня лініі партыі, асабліва зьвярнуўшы ўвагу на большае разгортваньне самакрытыкі ў раёне. РК і фр. РВК разгарнуць работу па барацьбе з усялякімі выпадкамі ганеньняў на селькораў.

3. Згаджаючыся з РК аб роспуску бюро Дукорскай парт'ячэйкі, лічыць неабходным роспуск бюро Сьмілаўскай парт'ячэйкі, абвясьціўшы абодвум распускаемым складам бюро гэтых ячэек суровую вымову.

4. За скрыўленьне клясавае лініі, заціск самакрытыкі, ганеньне на селькораў і садзейнасьць распаду калгасу, члена КП(б)Б **Валчэцкага** выключыць з радоў партыі; члена КП(б)Б **Дудко А. М.** за крымінальныя значкі (прысваеньне грошай), грубыя адміністраваньні, праўленьні антысавецкіх перагібаў — выключыць з радоў партыі і прыцягнуць да суовай адказнасьці; члену КП(б)Б **Шалаку П. С.** за скрыўленьне клясавай лініі, сыстэматычнае п'янства і сувязь з варожа-клясавым элэмэнтам, — абвясьціць суровую вымову з папярэджаньнем, зьняўшы яго з адказнай работы; члену КП(б)Б **Паваротнаму Д. С.**, за фіктыўны падзел сваёй гаспадаркі ў мэтах вызваленьня свайго бацькі ад індывідуальнага падатку, за замоўчваньне злоўжываньняў з боку старшыні сельсавету Дудкі — абвясьціць суровую вымову з папярэджаньнем, зьняўшы яго з займаемай пасады; членам КП(б)Б **Ірбенку М. Я., Харловічу Я. Х., Якуціку Х. М., Ультману А. Х.** за сыстэматычнае п'янства і сувязь з чужым элэмэнтам — абвясьціць суровую вымову.

5. За слабое кіраўніцтва работай парт'ячэйкі, за несваячасовае выкрыцьцё, нерашучае рэагаваньне на скрыўленьне лініі партыі і бытавое разлажэньне асобных камуністых раёну, бюро РК абвясьціць вымову, прапанаваўшы на бліжэйшым пленуме РК вывесьці са складу РК тав. **Шалака.**

6. Фр. РВК за нерэагаваньне на скрыўленьне лініі партыі і злоўжываньні асобных работнікаў саветаў — абвясьціць вымову.

У цэх'ячэйках па-старому

(Парткалектыў менскага чыгуначнага вузла)

Перабудова партработы ў парткалектыве вузла праходзіць вяла. Калі ў адносінах усяго парткалектыву сёе-тое зроблена, дык гэтага нельга сказаць пра цэх'ячэйкі.

Сэктары пры парткалектыве, за выключэньнем агітацыйна-масавага і грамадзкіх арганізацый не працуюць. Створаныя-ж сэктары пры цэх'ячэйках абсалютна бязьдзейнічаюць. У цэх'ячэйцы эксплёатацыі нават няма ніяму работ сэктараў. Увогуле ў цэх'ячэйках работа ідзе па-старому, ня ўжываюцца новыя формы і мэтады, няма баявых тэмпаў.

Партыец.

Завастрыць увагу партарганізацыі на барацьбе з актывізуючымся вялікадзяржаўным шавінізмам

З 20-га жніўня па 20-ае верасьня па Фрунзаўскім раёне будзе праводзіцца месячнік самаправеркі беларусізацыі

РЭЗАЛЮЦЫЯ ФРУНЗАЎСКАГА РК КП(б)Б

аб становішчы беларусізацыі па асобных прадпрыемствах і ўстановах раёну

Заслухаўшы паведамленьне аб праверцы становішча беларусізацыі ў паасобных прадпрыемствах і ўстановах раёну, бюро Фрунзаўскага РК КП(б)Б канстатуе:

а) Невыкананьне часткай ячэек, асобнымі гаспадарчымі і прафарганізацыямі дырэктыў партыі аб правядзеньні беларусізацыі; усё яшчэ маючую месца недаацэнку з боку раду партыйных і прафарганізацый, асобных камуністых значэньня беларусізацыі, як аднаго з асноўных сродкаў па ажыцьцяўленьні кіруючай ролі пралетарыяту да асноўных мас сялянства, як магутнай зброі ў змаганьні з беларускім нацыянал-дэмакратызмам, расійскім і іншым шавінізмамі.

б) Значнае паслабленьне і адставаньне тэмпаў беларусізацыі некаторых прадпрыемстваў і ўстаноў.

в) Зусім нездавальняючую пастаноўку кіраўніцтва і паслабленьне штодзённай праверкі практычнай работы па беларусізацыі.

г) Наяўнасьць фактаў грубага парушэньня дырэктыў партыі і ўраду па беларусізацыі, цярпімасьці да асобных вялікадзяржаўных выпадаў супроць беларусізацыі (ВСНГ, Дом Ураду, пошта) і ўсё яшчэ фармальна казённыя адносіны да правядзеньня беларусізацыі ў жыцьцё ня толькі з боку асобнай часткі беспартыйных працаўнікоў апарату, а нават камуністых - кіраўнікоў устаноў.

д) Недапусьцімае скарачэньне выпіскі і распаўсюджваньня беларускай літаратуры, газэт, асабліва «Зьвязды», на асобных ячэйках і культасьветных установах.

Праверка выкананьня дырэктыў партыі аб беларусізацыі з усёй сілай лішні раз пацьвярджае ўзросшую на фоне абвостранай клясавай барацьбы актывізацыю вялікадзяржаўнага расійскага шавінізму, які ў даным выпадку праяўляецца ў скрытым і адкрытым супраціўленьні і ігнараваньні правадзімай партыйнай палітыкі беларусізацыі.

Выходзячы з гэтага, бюро Фрунзаўскага РК КП(б)Б лічыць патрэбным на аснове правільнага ўяўленьня нацпалітыкі, выразнага практычнага правядзеньня яе ў жыцьцё, ні ў якім разе не паслабляючы штодзённай барацьбы з беларускім нацыянал - дэмакратызмам — агентурай і саюзьнікам польскага фашызму і шавінізмамі розных колераў (яўрэйскім, польскім і іншым), завастрыць увагу ўсёй арганізацыі на рашучую барацьбу з усімі праявамі вялікадзяржаўнага расійскага шавінізму, які зьяўляецца галоўнай небяспекай у справе ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Бюро РК КП(б)Б завастрае увагу ўсёй партарганізацыі, кожнага камуністага, кожнай ячэйкі на неабходнасьць неадкладнага пералому ў справе беларусізацыі, разгортваньня ў гэтай галіне запраўдных бальшавіцкіх тэмпаў, адказваючых усяму сацыялістычнаму будаўніцтву.

1. Правесьці на ўсім раёне з 20 жніўня па 20 верасьня месячнік шырокай масавай самаправеркі становішча беларусізацыі па ўсіх прадпрыемствах раёну.

2. У аснову зьместу месячніка самаправеркі палажыць: дасканалую праверку выкананьня пастаноў па пытаньнях беларусізацыі, вызначаных тэрмінаў па вывучэньні мовы, пераводу арганізацый на беларускую мову, укараненьне беларускае мовы ва ўсёй масавай рабоце і ўжываньне яе ў штодзённым жыцьці, наляпшэньне якасьці мовы, значнае пашырэньне распаўсюджваньня беларускай літаратуры і газэт, арганізацыя рэгулярнай работы па ліквідацыі няпісьменнасьці ў галіне беларусізацыі і забесьпячэньня кантролю над выкананьнем усіх дырэктыў па беларусізацыі.

3. Абавязаць бюро партыйных ячэек, фракцый і кіраўнікоў непартыйных арганізацый забясьпечыць неабходную падрыхтоўку і кіраўніцтва месячнікам самаправеркі беларусізацыі раёну.

Дасканала прасачыць за самаправерачнай работай, каб з усёй сур'ёзнасьцю—згодна ранейшых пастаноў вышэйшых парторганаў і ўраду — прыцягваць да партыйнай і савецкай адказнасьці за невыкананьне дырэктыў партыі па беларусізацыі.

4. Агітмасаваму аддзелу РК КП(б)Б распрацаваць рад практычных прапаноў па арганізацыі месячніка самаправеркі, арганізаваўшы дапамогу ў гэтым усім ячэйкам.

Кожную дэкаду на бюро заслухоўваць інфармацыю аб ходзе месячніка самаправеркі.

5. РК ЛКСМБ распрацаваць рад практычных прапаноў па ўдзелу ў правядзеньні месячніка самаправеркі па арганізацыі ЛКСМБ.

6. За нерашучую барацьбу з праявамі вялікадзяржаўнага шавінізму ў апараце, ігнараваньне і фармальнае выкананьне дырэктыў партыі аб беларусізацыі, бюро ячэек і партчасткі мясцкомаў ВСНГБ і Белпайгандлю абвясьціць вымову з папярэджаньнем.

Прасіць ЦКК прагледзець справу фармальных адносін да правядзеньня беларусізацыі — з боку партчасткі ВСНГБ і кіраўніка Белпайгандлю.

7. За няўважлівыя адносіны да правядзеньня беларусізацыі, розкага зьмяншэньня выпіскі «Зьвязды» сярод камуністых і рабочых — бюро парткалектыву і партчасткі фабкому заводу «Камунар», друкарні імя Сталіна, бюро ячэйкі Белдзяржгандлю — паставіць на від.

8. Паставіць пытаньне перад ЦП адпаведных саюзаў аб прыцягненьні да адказнасьці кіраўніцтва прафарганізацый адпаведных прадпрыемстваў і устаноў, меўшы адначасова суджэньне аб магчымасьці застаўленьня на рабоце загалчыкаў клюбамі: мэталістых, будаўнікоў і друкароў, якія не праводзілі з патрэбнай адказнасьцю ў рабоце клюбаў дырэктывы партыі па беларусізацыі.

9. Ячэйкам пошты і тэлеграфу, ВСНГБ прадставіць да чарговага бюро РК свае настановы па канкрэтных фактах вялікадзяржаўнага шавінізму, якія мелі месца ў гэтых установах.

НА НАРАДЗЕ ПАПЯРОВАЙ І ПАЛІГРАФІЧНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ

РАБОЧЫЯ МЭТАЛЁВАЙ І ЭЛЕКТРА-ТЭХНІЧНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ, ЗА ВАМІ СЛОВА!

У нас ёсьць значныя рэзэрвы для перавыкананьня вытворчай праграмы папяровых прадпрыемстваў

БОЛЬШ УВАГІ ДА РАБОЧЫХ ПРАПАНОЎ

Спрэчкі па дакладах т.т. **Туроўскага, Чорнага і Станкевіча** паказалі, што вытворчая праграма папяровай прамысловасьці рэальная. Аб гэтым гавораць рад фактаў перавыкананьня прамфінпляну тымі фабрыкамі, у якіх мелі месца арганізацыйныя і гаспадарчыя непаладкі («Гэрой Працы» і «Спартак»). Тыя прарывы, якія мы маем у папяровай прамысловасьці ёсьць вынік таго, што кіруючыя арганізацыі не скарысталі ўсе магчымасьці, якія маюцца на кожным прадпрыемстве.

Нарада выявіла ўсе недахопы ў рабоце і вызначыла далейшыя шляхі разьвіцьця папяровай прамысловасьці БССР.

АБ ЧЫМ ЗАБЫЛАСЯ БЕЛПАПЕРАБ'ЯДНАНЬНЕ

«Зьвязда» у свой час пісала аб спробах **Белпаперабʼяднаньня** спасылацца на «аб'ектыўныя» прычыны невыкананьня вытворчае праграмы. Нарада з свайго боку дала рашучы адпор такім спробам, якія затушоўваюць сапраўдныя прычыны невыкананьня прамфінпляну.

Невыкананьне павялічанага заданьня ідзе, галоўным чынам, за лік фабрыкі **«Спартак»**, на якой ад дрэннай пастаноўкі работы і нельга было чакаць лепшых вынікаў. Адміністрацыя ня прымала своячасовых мер да зьніччэньня непаладак і тэхнічных недахопаў. На **Добрускай** фабрыцы зацягвалася ўстаноўка шостай самачэрпалкі, з-за галавацяпскіх адносін да пабудовы памяшканьня для гэтай машыны, якое прышлося перабудоўваць два разы.

Наогул наглядаліся вялікія недарэчнасьці ў галіне капітальнага будаўніцтва. Так, напрыклад, з-за несваячасовага складаньня праектаў затрымліваецца работа на фабрыцы «Спартак», новага цэлюлёзнага заводу, з-за дрэннай прапрацоўкі пляну маюцца вялікія разрывы паміж тэрмінам будаўніцтва і дастаўкай абсталяваньня, з-за чаго на фабрыцы **«Гэрой Працы»** затрымліваецца ўстаноўка парасілавай станцыі.

На фабрыцы імя **Леніна** прастоі дасягаюць вялікіх разьмераў. Асноўнай прычынай гэтых прастояў зьяўляецца адсутнасьць тэхнічнага дагляду за машынамі **Белпаперабʼяднаньня** на прымала захаду да выніччэньня гэтых ненармальнасьцяй, а наадварот, былі выпадкі, калі па віне Белпаперабʼяднаньня выкліканіся прастоі. Напрыклад, на фабрыку **Леніна** былі прысланы сукны, разьмер якіх не адпавядаў гэтым машынам, што і выклікала прастоі.

Усё гэта ў значнай ступені адбівалася на выкананьні вытворчае праграмы.

ЦЫРКУЛЯРЫ ЗАЯДАЮЦЬ

Разгорнутае сацспаборніцтва і ўдарніцтва на папяровых прадпрыемствах адчувала вялікую патрэбу ў кіраўніцтве. Многія ФЗК («Чырвоная Зорка», «Прафінтэрн») ня ведалі, як распачаць сацспаборніцтва і ўдарніцтва, ЦП саюзу паперніка далей кіраўніцтва цыркулярам не пашоў. Наглядаліся зусім недапушчальныя адносіны з боку ФЗК і партыйных ячэек, якія гэтым пытаньнем зусім мала займаліся («Прафінтэрн», «Спартак» і інш.). У выніку— **рабочыя масы ня былі мабілізаваны вакол прарываў у вытворчай праграме.**

Пасьўныя адносіны да афармленьня дагавароў ударных брыгад і недастаткова дапамога ў іх арганізацыі выклікала бязьдзейнасьць іх у галіне змаганьня за выкананьне вытворчай праграмы. Мала гэтага. Некаторыя прадпрыемствы («Гэрой Працы», «Чырвоная Зорка». «Прафінтэрн») зусім павярхоўна падышлі да абвяшчэньня сябе ўдарнымі, не правялі папярэдняй падрыхтоўкі да гэтага мерапрыемства.

Ва ўсёй правадзімай рабоце ганебна адставалі клюбы, якія не перабудавалі сваю работу ў адпаведнасьці да запатрабаваньняў сацспаберніцтва і ўдарніцтва.

НІЯКАЙ УВАГІ ПРАПАНОВАМ РАБОЧЫХ

Дырэктывы партыі ў галіне выкананьня рабочых прапаноў выконваліся надзвычайна слаба. Многія прапановы засталіся нявыкананымі і нават нераспрацаванымі. На фабрыцы **«Гэрой Працы»** карысная ініцыятыва рабочых па ўпчыньненьні рабочага дня не падтрымлівалася адміністрацыяй і вытворчай камісіяй. Такія адносіны да рабочых прапаноў выклікалі памяншэньне колькасьці рабочых прапаноў. Так, напрыклад, на фабрыцы **«Спартак» за увесь час паступіла ўсяго 18 прапаноў.**

Рацыяналізатарскія мерапрыемствы праводзіліся вельмі марудна, з тае прычыны, што рацыяналізатарскія ячэйкі забесьпячэньня тых недахопаў, бо вы толькі зможаце своячасова выконваць заказы папяровай прамысловасьці.

Усебеларуская нарада работнікаў папяровай і паліграфічнай прамысловасьці, рэспубліканскі штаб «паходу за паперу» **заклікае ўсіх рабочых мэталюргічнай і электратэхнічнай прамысловасьці ўзяць на сябе абавязак своячасова выконваць усе заказы папяровай прамысловасьці, ударыць па бюракратызьме і цяганіне ў гэтай галіне работы.** Усе гэтыя перашкоды і зрывы зьяўляюцца справай рук **правых апартуністычных элэмэнтаў, агентаў клясавага зорага ў нашых радах.**

Мэталістыя, рабочыя папяровай прамысловасьці чакаюць ад вас рашучага дзеяньня, тым самым вы ўключыцеся ў вялікі палітычны «бой за паперу».

Прэзыдыум.

Усім рабочым мэталюргічнай і электратэхнічнай прамысловасьці

Пастановы XVI зьезду УсеКП(б) абавязваюць папяровую прамысловасьць забясьпечыць матар'яльную базу культурнага будаўніцтва. Рабочыя папяровай прамысловасьці **БССР** узяліся гэтыя пастановы партыі выканаць поўнасьцю. Выкананьне абавязацельства перад краінай даць 2 мільёны тон паперы ў значнай ступені тармозіцца несваячасовым забесьпячэньнем патрэбным абсталяваньнем як дапаможнымі, так і запаснымі часткамі да машын. Перадача заказаў, якая зацягваецца з прычыны цяганіны, і бюракратычных адносін, выклікае вялікія прастоі, адцягвае тэрмін пуску новых цэхаў і агрэгатаў. Усё гэта шкодзіць разьвіцьцю папяровай прамысловасьці. Ад вас, рабочых мэталюргічнай і электратэхнічнай прамысловасьці залежыць зьніччэньне гэ

Савецкія трактары—на замежныя рынкі



Гэтымі днямі з Ленінграду параходам была адпраўлена за межы першая партыя трактараў савецкай вытворчасьці тыпу «Фардзон Пуціловец». Трактары закуплены Турцыяй і Пэрсыяй.

НА ЗДЫМКУ: пагрузка трактараў на Пуціловскім заводзе.

У БАРАЦЬБЕ ЗА КАДРЫ

За рэарганізацыю с-г. ВНУ і тэхнікумаў

Ударнымі тэмпамі рыхтаваць кадры сель.-гас. спэцыялістых

(На нарадзе пры НДІ)

НЕ ХАПАЕ Ў ГЭТЫМ ГОДЗЕ 4057 СПЭЦЫЯЛІСТЫХ ПА СЕЛЬГАСПАДАРЦЫ

Учора скончыла сваю работу нарада дырэктароў, навуковых працаўнікоў разам з прадстаўнікамі студэнцтва сярэдніх і вышэйшых сельска-гаспадарчых навучальных устаноў. Нарада абгаварыла пытаньне аб падрыхтоўцы сельска-гаспадарчых кадраў.

Дакладчык **тав. Бондар** у сваім дакладзе ахарактарызаваў цяперашняе становішча з падрыхтоўкай гэтых кадраў. Узмацненьне і далейшы рост сацыялістычнага сэктару вёскі востра ўпіраецца ў падрыхтоўку патрэбнай колькасьці с.-г. спэцыялістых і кіруючых кадраў. Між іншым па цэлым радзе спэцыяльнасьцяй у нас шмат не хапае спэцыялістых з сярэдняй і вышэйшай адукацыяй. У бягучым 1929-30 годзе недахоп кадраў з вышэйшай адукацыяй складае **702 чал.**, з сярэдняй—**3834**, а ў 1930-31 г. недахоп будзе **1057** спэцыялістых з вышэйшай адукацыяй і **3000** чал. з сярэдняй. К канцу пяцігодкі трэба будзе мець спэцыялістых з вышэйшай адукацыяй каля 5.000 чалавек. Асабліва многа не хапае насенаводаў, зоатэхнікаў і лесаводаў. Для пакрыцьця недахвату ў галіне сельгаспэцыялістых патрэбна многа энэргіі і ўвагі з боку навучальных устаноў і адпаведных арганізацый.

ЯКІЯ НАМ ПАТРЭБНЫ СПЭЦЫЯЛІСТЫЯ

Спэцыялістыя па сельскай гаспадарцы, якія ёсьць, у некаторай частцы не адпавядаюць патрэбам сучаснага сацыялістычнага будаўніцтва. Аграномы, якія выйшлі з «унівэрсальнай школы» якія падрыхтаваны на адсталых індывідуальных гаспадарках не заўсёды здольны будаваць буйную сацыялістычную гаспадарку. Сацыялістычная рэканструкцыя сельскай гаспадаркі паставіла задачу падрыхтаваць новы тып спэцыялістага; патрэбен інжынэр па вузкіх галінах сельскай гаспадаркі, патрэбен інжынэр-мэханізатар, мэханік-тэхналёгі, патрэбен зоатэхнік па ўсіх відах жывёлагадоўлі, патрэбен арганізатар масавай калектыўнай працы і г. д.

Выкананьне гэтай задачы патрабуе рэарганізацыі ўсяе сыстэмы навучальных устаноў і пераводу яе на новыя рэйкі. Трэба стварыць школу-прадпрыемства, увязаўшы тэорыю з практыкай. **Кампанія пасеўная і ўборачная павінны адыграць рашаючую ролю ў практыцы студэнтаў.** Трэба ўзмацніць работу с.-г. ВНУ і тэхнікумаў, пераводзячы іх на бесьперапынны навучальны год і бесьперапынную вытворчую практыку. Першыя крокі ў гэтай справе ўжо зроблены.

Цяперашні сацыяльны склад спэцыялістых недавальняючы. Нам трэба дасягнуць, каб сярод с.-г. спэцыялістых 80 проц. было рабочых і калгасьнікаў як мінімум; адсюль і ўвага набору ў навучальныя ўстановы ў гэтым годзе.

ЗА ПАДРЫХТОЎКУ МАСАВЫХ КАЛГАСКІХ КАДРАЎ

Побач з падрыхтоўкай кадраў каманднага складу, паўстае пытаньне падрыхтоўкі масавых кадраў, агранамізацыя насельніцтва. Друк, радыё, сэмінарый, гурткі павінны быць скарыстаны для азнаямленьня насельніцтва з ведамі па агранаміі. Патрэбна правядзеньне кароткатэрміновых курсаў па падрыхтоўцы калгасных кадраў.

З боку ўрадавых органаў зьвернута асаблівая ўвага на падрыхтоўку с.-г. спэцыялістых Калі ў 1927-28 годзе па падрыхтоўку с.-г. кадраў было адпушчана 1.852.000 р., дык на 1930-31 год, згодна пастановы СНК БССР, на падрыхтоўку с.-г. спэцыялістых адпушчана 10 млн. рублёў. Выкарыстаньне гэтых сродкаў павінна быць рацыянальнае. Трэба арганізаваць грамадзкую думку і ўсе навуковыя сілы для рацыянальнага выкарыстаньня гэтых сродкаў.

УВАГА ВЫТВОРЧАЙ ПРАКТЫЦЫ

Па дакладу разгарнуліся шырокія спрэчкі. Амаль што ўсе выступаўшыя адзначалі, што навучальныя ўстановы яшчэ не пераключыліся на новыя рэйкі, што будаўніцтва навучальных устаноў праходзіць вельмі дрэнна.

Скрыгалаўскі с.-г. тэхнікум (Мазыршчына), Барысаўскі с.-г. тэхнікум (Меншчына) ня маюць **50 проц.** інтэрнатаў, а аб будаўніцтве ніхто не падумаў. А там, дзе і праводзіцца, яно ідзе надта марудна, няма сродкаў тэхнічнага нагляду і г. д.

Усе выступаўшыя гаварылі аб дрэннай пастаноўцы вытворчай практыкі студэнтаў. Разьмеркаваных студэнтаў для практыкі ў Мазырскай і Гомельскай акругах, Акркалгассаюзы не жадалі прыняць, а калі пад націскам іх прынялі, дык адправілі на два месяцы раней тэрміну. Ільнапрадзільнае абʼяднаньне не жадае браць на практыку студэнтаў с.-г. тэхнікуму, у зьвязку з пераходам тэхнікуму ў веданьне ВСНГ. Студэнты, якія пасылаліся на практыку, часта выконваюць чорную работу, не скарыстоўваюцца па спэцыяльнасьці. Назіраецца «ўцечка» студэнтаў з адных установы ў другую з прычыны матар'яльнай выгады. Былі выпадкі, калі практыку кідалі раней тэрміну.

Навуковы працаўнік акадэміі навук т. **Берзін** расказаў якую ролю адыгрывае практыка ў галіне падрыхтоўкі кадраў. Дасьледчая станцыя акадэміі навук правяла вопыт вылучэньня рабочых ад варштату ў якасьці практыкантаў станцыі. Пасьля гадовай практыкі гэтыя вылучэнцы былі пралушчаны праз сэмінарый, кароткатэрміновыя курсы. **У выніку—мы атрымалі добрых спэцыялістых. Вылучэньне рабочых у якасьці практыкантаў трэба практыкаваць і надалей.**

СТВАРЫЦЬ НОВЫЯ ВОПЫТНЫЯ ЗАНАЛЬНЫЯ СТАНЦЫІ

Асабліва востра стаіць пытаньне з падручнікамі ў навучальных установах. Навуковыя работнікі ня прынялі захаду для выпуску новых падручнікаў па пытаньнях сельскай гаспадарцы.

Існуючыя дасьледчыя станцыі маюць дрэнную сувязь з сярэднімі навучальнымі ўстановамі.

У справе аховы расьлін зусім дрэнна ідзе падрыхтоўка кадраў. У сетцы навучальных устаноў нават ніводнай установы па падрыхтоўцы гэтых кадраў.

Нарада прыняла цэлы рад пастаноў накіраваных на наляпшэньне работы па падрыхтоўцы кадраў па сельскай і лясной гаспадарцы. Намечана правядзеньне спэцыялізацыі навучальных устаноў правядзеньне практыкі студэнтаў,

ПЕРШАЯ УСЕБЕЛАРУСКАЯ

ДАРОГІ, ЧЫГУНКІ

(У павільёне транспарту)

Павільён транспарту можна назваць камбінаваным павільёнам. Тут размешчаны экспанаты Галоўдартрансу і Народнага Камісарыяту Шляхоў Зносін. Апроч таго паказаны рэчы камунальнага дабрабыту (маделі водаправоду, пажарных машын, жыльлёвых будынкаў і г. д.).

Аддзел Галоўдартрансу ў сваю чаргу падзяляецца на тры цыклы: навукова-дасьледчую станцыю па вывучэньні глеб, разьдзелы мастоў і дарог.

У аддзеле Галоўдартрансу асабліва прыкоўваюць увагу экскурсантаў мастацкі зробленыя маделі, якія характарызуюць паступовае разьвіцьцё нашых мастоў. Вось у кутку пад надпісам «Спадчына царскага ўраду» прадстаўлены старажытныя сельскія масты далёкай Мазыршчыны. Напалову паламаныя, прымітыўныя па архітэктуры, як той мазо'ял, з якога яны яроблены (сучо ды кольлі), якой архаічнасьцю ядзюцца яны ў параўнаньні з нашымі жалезнымі мастамі на гранітных падпорах будоўлі 1929-30 г. г.!

У спэцыяльны разьдзел вынасчаны пантонныя і часовыя масты №-скае сапёрные роты.

Што датычыць другога разьдзелу, дык ... вельмі цікавы экспанаты гудранізаваных дарог, г. зн. такіх дарог, на якіх буйны жвір сцементаваны спэцыяльнай матэрыяй, накшталт каланіцы. Гудранізаваныя дарогі ўводзяцца ў Беларусі пакуль што толькі, як вопыт — выключна ў Менскай акрузе. Але паводле думак спэцыялістых ім належыць вялікая будучыня.

Прадстаўлены тут брукаваныя, бэтанаваныя і шосавыя дарогі. Аб няўхільным паляпшэньні апошніх гаворыць са сьцяны дыяграма:

— У 1927-28 годзе прыведзена ў парадак 65 проц. шосавых дарог; у 1932-33 г. будзе прыведзена ў парадак 100 проц.

Кідаецца ў вочы, што ў аддзеле Галоўдартрансу ня зусім удала разьмеркаваны матар'ялы: з-за недахвату месца там літаральна няма дзе павярнуцца.

Надзвычайна ўдала зроблены ў аддзеле дарожнага камісарыяту шляхоў зносін маделі паравозаў і вагонаў.

Начэснае месца займаюць тут 6 шчытоў, якія дэманструюць вынаходзтва на Заходняй і МВБ чыгунках. Да рэчы, з 236 прапанаваных за адзін год праектаў 109 належаць рабочым, сьлесарам і мантёрам.

Асноўны недахоп: вы нідзе ня ўбачыце тут матар'ялаў аб сапэнаборніцтве і ўдарніцтве па транспарце...

Дакладна праілюстравана, як паасобнымі рэчамі, так і чарцяжамі, тэхніка руху на чыгунцы. У гэтым-жа пакоі знайшлі сабе месца экспанаты водная транспарту. Між іншым, тут вызначаецца праект Гомельскага порту.

Але чамусьці якраз у гэтым цікавейшым месцы павільёну амаль не даецца адпаведных тлумачэньняў. Як ні шкада, але тут, як відаць, ня вызначан для гэтай мэты спэцыяльны чалавек.

Камунальны аддзел па сутнасьці не ўтрымлівае з сабе нічога асаблівага. Там — розныя калодзежы (просты, драўляны, бетанаваны, арэзіянскі), водаправод, узоры пажарных абозаў і прылад. Як нельга лепш пераконвае ў перавазе камунальнага, грамадзкага будаваньня жыльля процістаўленьне індывідуальных, бярвенчатых домікаў з вялікімі новымі дамамі Менску, Віцебску і Магілеву.

... Знадворку павільён — просты, і ў прастаце сваёй даволі значны і прыгожы.

Унутры ён абсталяваны цікавымі экспанатамі, з якіх кожны паведвальнік здолее ўявіць сабе сучаснае становішча і перспэктывы разьвіцьця нашага транспарту.

Юр. Л—ны.

Нямецкая рабочая дэлегацыя ў Менску

Гэтымі днямі ў Беларусь прыехала дэлегацыя нямецкіх рабочых. Дэлегацыя прывезла з сабой сьцяг ад ленінскіх друкароў, які перадала калгасу «Расьсьвет - Пераможца».

Дэлегацыя была на адкрыцьці Усебеларускай выстаўкі. У склад дэлегацыі ўваходзяць: Ото Бэсьлер — друкар, камуністы; К. Рыхтэр, таксама член партыі і друкар і т. Шот — мэталіст, які працуе зараз на мэталяпрацоўным заводзе ў рэспубліцы немцаў Паволжжа.

Нам пішуць

СЬВІНАРНІК БЯЗ ДАХУ

У жніўні 1929 г. **Белсельтрэстам** пастаноўлена пабудаваць у саўгасе **«Дабрынь»** (Мазыршчына) сьвінарнік коштам у 16.000 руб. У тым-жа годзе і распачата пабудова гэтага сьвінарніку. **Белсельтрэст** спачатку перавёў для гэтай пабудовы ўсяго 10.000 рублёў, астатнія 6.000 руб. абяцаў перавесьці пазьней. Сёлета пабудова сьвінарніку амаль што закончылася, засталося пакрыць яго толькі дахам. З прычыны таго, што **Белсельтрэст** не дадае рэшткі грошай, будаўніцтва сьвінарніку ня можа быць закончана.

Т. М.

БЕЗ СЕНАЖАЦІ І ПАПАРУ

Плешчаніцкі РВК увесь час карміў абяцаньнямі калгас **«Іскра»**, што ім будзе адпушчана патрэбная колькасьць сенажаці і папару. Але гэтыя абяцаньні не праведзены ў жыцьцё. Калгас **«Іскра»** зараз застаўся без сенажаці і папару.

КАЛГАСЬНІКІ.

Экскурсанты аглядаюць выстаўку

Будні выстаўкі

Больш увагі абслугоўваньню экскурсантаў

За апошнія два дні на першую Усебеларускую выстаўку сельскай гаспадаркі і прамысловасьці прыбыло арганізаваным парадкам каля 3.000 экскурсантаў.

У гэты лік не ўваходзяць тыя экскурсанты, якія прыяжджаюць на выстаўку за свой кошт.

Паколькі агляд выстаўкі толькі пачаўся, трэба адразу-ж сыгналізаваць аб недахопах, якія ёсьць у абслугоўваньні экскурсантаў.

Экскурсбюро не спраўляецца са сваімі задачамі. На вакзале няма дяжурных экскурсбюро. Бываюць такія выпадкі, калі экскурсанты са станцыі едуць адразу на выстаўку, а дырэкцыя выстаўкі адсылае іх зноў на станцыю ў... экскурсбюро (якога там няма). На самой выстаўцы прыёмны пункт экскурсбюро таксама не працуе.

Дрэнна абстаіць справа з тлумачамі. Мэталяаб'яднаньне, ВСНГ і інш. арганізацыі дагэтуль яшчэ ня вылучылі тлумачоў. Тыя экспанаты, якія прысылала мэталяаб'яднаньне на выстаўку, застануцца мёртвым кавалкам жалеза для масавага экскурсанта. Лошыцкая дасьледчая станцыя таксама яшчэ ня вылучыла тлумачоў. С.-г. акадэмія не дадала **20 тлумачоў.** Ня ўсе вылучаныя тлумачы адпавядаюць свайму прызначэньню, не даюць досыць выразную палітычную ўстаноўку ў сваіх тлумачэньнях, абмяжоўваючыся сухімі фармальнымі данымі. Напрыклад пры аглядзе дыяграм, у павільёне прамысловасьці, тлумачы ня спыняюцца на тых фактарах, якія сцрыялі яе росту, якія зьяўляюцца стымулам для далейшага яе разьвіцьця.

У камунальным аддзеле павільёну шляхоў зносін зусім няма тлумача. Тыя дыяграмы, над якімі шмат працавалі, па якія затрачана шмат сродкаў і якія навіны былі гаварыць аб нашых дасягненьнях, — застаюцца часта кітайскімі граматамі для экскурсантаў, бо без тлумачэньня самі яны ня могуць разабрацца ў лічбах і малюнках.

Як ненармальнае зьявішча трэба адзначыць тое, што ні адзін тлумач, які працуе ў павільёне прамысловасьці, растлумачваючы, ня ўжывае **беларускае мовы.**

З боку часткі групаводаў таксама назіраюцца безадказныя адносіны да сваіх абавязкаў. Яны пакідаюць даручаныя ім групы экскурсантаў і адыходзяць на доўгі час па сваіх асабістых справах.

Неарганізаванаму агляду выстаўкі злачынна спрыяе і ЦРК; ня ўсе ларкі, пабудаваныя на выстаўцы адкрыты. Экскурсанты прастойваюць доўгі час у чэргах.

Гарсавет і трамвайнае кіраўніцтва ня раз абяцалі арганізаваць скорую дастаўку экскурсантаў і тлумачоў на выстаўку. Але тыя сродкі, якія павінны былі гэтаму дапамагчы, на гэту справу не мабілізаваны.

Дрэнна абстаіць справа з забесьпячэньнем памяшканьнямі студэнтаў-тлумачоў, якія прыехалі з іншых гарадоў. Замест 280 месц, якія павінны былі даць у Доме Сялянина, ім далі 100 месц. Некаторыя з іх жывуць у калідоры Дому Сялянина. Відома, што ў такіх умовах рыхтавацца да работы цяльга. Між тым, сярод іх ёсьць студэнты першага курсу, якія без папярэдняй падрыхтоўкі з сваімі абавязкамі ня могуць справіцца.

Шмат якія клюбы, прызначаныя пад інтэрнаты для экскурсантаў, знаходзяцца ў антысанітарным стане. Экскурсанты часта сьпяць на голай падлозе.

Але, калі экскурсанты, якія прыяжджаюць арганізаваным парадкам, больш менш забесьпечаны памяшканьнем і харчамі, дык беднякі і сераднякі, што прыяжджаюць за свой кошт, застаюцца без усякай увагі з боку экскурсбюро. Калі прыняць пад увагу тое, што тэрмін агляду выстаўкі строга вызначаны, дык пры арганізацыі работы, якая ёсьць на сёнешні дзень, ствараецца пагроза, што экскурсанты не пасьпеюць агледзець выстаўку. І тыя сродкі, якія затрачаны імі на прыезд, не апраўдаюць сябе.

Трэба зараз-жа зрабіць адпаведны пералом у бок ліквідацыі гэтых недахопаў, каб у далейшым забесьпечыць арганізаваны агляд выстаўкі.

Яз. С—ны.

Забесьпечыць выкананьне дырэктыў партыі і ўраду

Партыйныя, камсамольскія і прафсыяпальныя арганізацыі Прапойскага раёну, у часе ўборачнай кампаніі практычна дапамагалі ў рабоце калгасам. Былі вылучаны ў чатыры калгасы брыгады, у ліку 204 чалавек. У выніку гэтага ўборачная кампанія праходзіць пасьпяхова. У асобных калгасах («Перамога», «Ленінец») жыта ўжо ўбрана і скошана сенажаць.

Разам з гэтым ёсьць і недахопы. Выкананьне дырэктыў партыі па пытаньнях сіласаваньня праходзіць марудна. Практычна да гэтага часу яшчэ нічога ня зроблена. Распачатае будаўніцтва сіласных ям і вежаў ня скончана, а шмат калгасаў яшчэ зусім не распачалі гэтае будаўніцтва.

Прапойскаму РВК і РК КП(б)Б неабходна зьвярнуць асаблівую ўвагу на павялічэньне кармовай базы ў раёне.

ЛЕВІН.

Уперад да новых перамог

Прывітаньне т. ГЕЯ

Вітаю адкрыцьцё Усебеларускай выстаўкі. Выказваю цьвёрдую ўпэўненасьць у пасьпяховым ажыцьцяўленьні асноўнай задачы — паказаць работу буйнов савецкае і калгаснае гаспадаркі, дапамагчы шырокім сялянскім масам у пасьпяховым разьвіцьці калгаснага руху. Правсдзячы палітыку ліквідацыі кулацтва, як клясы, адкрываючы беднаце і серадняку шляхі калектывізацыі, партыя з посьпехам кіруе справай пабудовы сацыялізму.

Уперад, да новых перамог на гэтым шляху.

ГЕЙ.

Магутная прылада індустрыялізацыі і калектывізацыі

Прывітаньне т. Галадзеда

Шкадую, што з прычыны хваробы не магу прысутнічаць на ўрачыстым адкрыцьці Усебеларускай выстаўкі. Галоўнай задачай выстаўкі зьяўляецца — мабілізацыя ўвагі ўсяе рабочае клясы, калгасьнікаў і бядняцка - серадняцкага сялянства вакол узмацненьня тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва. Трэба дабіцца, каб пралетарыят БССР пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі ператварыў выстаўку ў магутную прыладу мабілізацыі энэргіі і сродкаў усіх працоўных для далейшай індустрыялізацыі краю і суцэльнай калектывізацыі вёскі. Выстаўка павінна наглядна прадэманстраваць бурны працэс перабудовы адсталай у мінулым Беларусі ў рэспубліку ўзрастаючага сацыялізму з буйной прамысловай вытворчасьцю і з калектывізаванай сельскай гаспадаркай.

Асабліва выстаўка павінна прадэманстраваць перад шырокімі масамі беднаты і серадняку кіраўнічую і пераўтвараючую ролю буйной прамысловасьці ў адносінах сельскай гаспадаркі. Выстаўка павінна наглядна паказаць сялянству перавагу калектыўнага зямляробства перад індывідуальным і зьвяцца моцным штуршком да далейшай суцэльнай калектывізацыі.

Горача вітаю ўсіх будаўнікоў выстаўкі, выканаўшых у тэрмін заданьне ўраду. Жадаю посьпеху.

Старшыня Галоўнага Выставачнага Камітэту, Старшыня СНК БССР

Н. ГАЛАДЗЕД.

Практыка „сустрэчнага прамфінпляну" пашыраецца

ПЕРАДАВЫЯ ПРАДПРЫЕМСТВЫ ПАКАЗВАЮЦЬ ПРЫКЛАДЫ КАМУНІСТЫЧНЫХ АДНОСІН ДА ПРАЦЫ

Фабрыкі і заводы БССР, засталося 50 дзён да пачатку трэцяга году пяцігодкі. Арганізуйце неадкладна прапрацоўку кантрольных лічбаў і „сустрэчны прамфінплян"

МАБІЛІЗУЙЦЕ СКРЫТЫЯ НЕСКАРЫСТАНЫЯ РЭСУРСЫ КОЖНАГА ЦЭХУ, КОЖНАГА ВАРШТАТУ

Работа ўдарнікаў ленінградскага заводу імя Карла Маркса і іх заклік не засталіся без адказу. Па ўсім Савецкім Саюзе энтузіясты пяцігодкі ўзяліся за складаньне «сустрэчных прамфінпляну», выяўляючы скрытыя, нескарыстаныя рэсурсы сваіх цэхаў і варштатаў.

Прыкладу рабочых ленінградскага заводу імя Карла Маркса пасьледвалі рабочыя **маскоўскага электразаводу.**

Як нарадзіўся «сустрэчны прамфінплян» на электразаводзе?

— «Атрымаўшы кантрольныя лічбы, — піша **«Правда»**, — брыгады вылучылі па два чалавекі (рабочы і тэхнік). Кожная такая пара распрацоўвала свае «кантрольныя кропкі» і выносіла іх на абгаварэньне агрэгатаў. Рабочага, які прыходзіў абгаворваць плян, пыталі: «Ты павінен зрабіць за год столькі лямпачак. Скажы, ці зможаш ты выканаць гэту лічбу, што можна палепшыць у тваёй рабоце, ці можаш ты зьнізіць брак, што табе перашкаджае, чаго не хапае?». У выніку паступіла звыш 300 канкрэтных прапаноў. Плянавыя брыгады потым падвялі вынікі, якія былі абгавораны на цэхавых вытворчых нарадах. Вынік гэтага такі: на 1930-31 год заводу дадзена заданьне выпусьціць 48 млн. лямпачак, а рабочыя ўзяліся выпусьціць **60 мільёнаў** без дадатковых укладаньняў, толькі за лік павялічэньня прадукцыйнасьці, памяншэньня браку, большага скарыстаньня абсталяваньня, большай рацыяналізацыі вытворчасьці.

Нараджэньне «сустрэчнага пляну» на маскоўскім электразаводзе стала магчымым толькі дзякуючы таму, што завод **шырока ахоплены сацыялістычным спаборніцтвам, ударніцтвам і што адміністрацыя дала цэхам падрабязна распрацаваныя кантрольныя кропкі і давяла іх да кожнай брыгады, агрэгату і варштату.**

На ленінградзкім заводзе **«Чырвоны трохкутнік»** складаньне «сустрэчнага прамфінпляну» скончана. Была вылучана 71 брыгада. У гэтых брыгадах працавалі 800 рабочых. Брыгады правялі 150 сходаў, ахапіўшы 7.000 рабочых. **Унесена 1.000 прапаноў.** У выніку «Чырвоны трохкутнік» выпусьціць у 1930-31 годзе прадукцыі **на 12 мільёнаў руб. больш,** чым гэта прадугледжвалася па паметцы гаспадарчага органу.

На заводзе **імя Дзяржынскага ў Днепрапятроўску** рабочыя высунулі «сустрэчны прамфінплян», у якім праграма **па выпуску чыгуну павялічана на 19.000 тон, па выпуску сталі на 67,5 проц., па пракату — на 3.500 тон.**

Гэтыя прыклады пераканаўча кажуць аб наяўнасьці на прадпрыемствах вельмі значных упутраных рэсурсаў, якія могуць быць і павінны быць неадкладна мабілізаваны на службу пяцігодцы.

У нас, у БССР практыка «сустрэчнага прамфінпляну» пашыраецца вельмі марудна. Пакуль што можна гаварыць аб вопыце аднаго-двух прадпрыемстваў. Асабліва шырока трэба папулярызаваць практыку Гомельскага машынабудаўнічага заводу **«Пралетары»,** на якім, дзякуючы ініцыятыве ўдарнай брыгады лицейнага цэху, удалося павялічыць выпрацоўку бэтонамяшалак і даць магчымасьць павялічыць праграму выпрацоўкі гэтых машын на 1930-31 год амаль **на 50 проц.** (гл. учарайшы нумар «Зьвязды»).

Пачынае разгортвацца гэта работа і на Менскай цэлюлёзна - галалітавай фабрыцы **«Беларуска».** Вядзецца падрыхтоўчая работа для складаньня «сустрэчнага прамфінпляну» і па заводзе **«Энэргія».**

Але пакуль што гэтыя прадпрыемствы — **адзінкі.** Масавага руху **яшчэ няма.** Яшчэ маўчаць такія волаты нашай прамысловасьці, **як віцебскі завод «Чырвоны Мэталісты»,** папяровая фабрыка **«Гэрой Працы»,** машына - **будаўнічы завод імя Ланцуцкага,** запалкавыя фабрыкі **«Чырвоная Бярэзіна»** і **«Пралетарская Перамога»** і **рад інш.**

Тлумачыцца гэта ў першую чаргу тым, што **прафсыянальныя арганізацыі не правялі яшчэ вакол пытаньня аб «сустрэчным прамфінпляне» ніякай масавай работы.** Як гэта паказала праверка, праведзеная рэдакцыяй «Зьвязды», **многія прафработнікі кажуць ня чулі аб існаваньні такой формы працы, як «сустрэчны прамфінплян».**

Такое становішча прымушае біць трывогу. **Да пачатку трэцяга году пяцігодкі застаўся 51 дзень.** За гэты час трэба ліквідаваць прарывы ў выкананьні прамфінпляну, якія маюць месца на многіх прадпрыемствах. А з найбольшым посьпехам ліквідаваць прарывы ўдасца **пры добрай арганізацыі «сустрэчнага прамфінпляну»,** бо ён **ужо сёньня** паказвае шляхі для мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў нашых прадпрыемстваў, для павялічэньня прадукцыйнасьці варштатаў, для выкананьня прамфінпляну **бягучага году.**

Застаўся 51 дзень! За гэты кароткі час трэба разгарнуць сапраўды ўдарныя тэмпы. Прафсаюзныя арганізацыі павінны абавязкова стаць на чале руху за «сустрэчны прамфінплян».

Першыя 50 прапаноў на фабрыцы „Беларуска"

Цэлюлёзна-галалітавая фабрыка «Беларуска» — новае прадпрыемства. Пры адчыненьні фабрыкі ўпілося шмат новых рабочых. Многія з іх упяршыню трапілі на сацыялістычнае прадпрыемства. Таму ўвесь час на фабрыцы наглядаецца вельмі вялікая цякучасьць рабсілы, частыя выпадкі парушэньня працадысцыпліны.

Культурна-выхаваўчай работы сярод рабочых да апошняга часу амаль не вялося. Кіраўніцтва сацсаборніцтвам і ўдарніцтвам ня было. Стары склад фабкому мала цікавіўся вытворчасьцю, не мабілізоўваў увагу рабочых на значных прарывах ў выкананьні прамфінпляну.

Былы дырэктар Дзіканаў груба адносіўся да рабочых. Толькі і чуць было сіўся да рабочых. Толькі і чуць было ад яго — «Выганю, разьлік, на разваджаць...» На допісы рабкораў адміністрацыя ніколі не адказвала, прапановы рабочых ня выконваліся, ініцыятыва рабочых душылася.

У выніку — дырэктара зьнялі з працы. Абралі новы фабком. Паступова работа перабудоўваецца па-новаму.

Першы заклік фабрычных арганізацый да рабочых быў наступны:

— Давайце прапановы, дапамажэце ліквідаваць прарывы, агульнымі сіламі выканаем прамфінплян.

— Спачатку на варылі рабочыя, што, нарэшце, да іх прапаноў пачнуць прыслухоўвацца, — кажа старшыня фабкому т. Сачук. — Але дапамог наш друк. Праз некаторы час нам удалося арганізаваць 10 ударных брыгад з 70 чал. і выступіць адзіным фронтам супроць страт, супроць браку, супроць усіх недахопаў на вытворчасьці.

У апошні час на фабрыцы праведзены рад гутарак з рабочымі аб значэньні дня індустрыялізацыі і аб «сустрэчным прамфінпляне». Рабочым раздадзены спэцыяльныя сшыткі для запісваньня вытворчых прапаноў. Выклік рабочых ленінградзкай фабрыкі імя Карла Маркса аб арганізацыі «сустрэчнага прамфінпляну» рабочыя фабрыкі «Беларуска» прынялі з вялікім энтузіязмам. Толькі за апошнія дні паступіла 50 розных прапаноў аб паляпшэньні вытворчасьці. Напрыклад, камсамолец тав. Мікупрэвіч, прапанаваў новы спосаб рэзкі гузікаў, які павінен павялічыць прадукцыйнасьць працы ў два разы. Тав. Лапкіс унёс прапанову не пакаваць гузікі ў карабкі, а заварочваць у паперу, скарыстаўшы для гэтай мэты непатрэбную абгортачную паперу ад цэлюлёзы. Прапанова павінна даць 1.200 руб. эканоміі ў год. Работніца Сёня Шапіра падала заяву ў вытворчы сэктар аб тым, каб ле перавялі з двух фасаніровачных варштатаў — на тры, матывуючы тым, што працуючы на двух варштатах, яна ня мае поўнай нагрузкі і г. д.

Першыя 50 прапаноў зьяўляюцца вельмі каштоўным укладам у работу фабрыкі. Гэтыя прапановы павінны дапамагчы наблізіць выкананьне прамфінпляну да лічбаў бягучага году і стварыць практычную глебу для складаньня «сустрэчнага прамфінпляну» на 1930-31 год.

ЦП саюзу дрэваапрацоўшчыкаў павінна дапамагчы фабрыцы справіцца з гэтай адказнай задачай, вывучыць практыку ня работы і распаўсюдзіць гэту практыку на ўсе свае прадпрыемства.

А. МАНЬКОЎ.



Павільён прамысловасьці.

Правяраем рабочае забесьпячэньне

45 СТРАЧАНЫХ ДЗЁН

БЕЛКААПСАЮЗ І МЦРК НЯ ВЫКАНАЛІ ДЫРЭКТЫВЫ ЦК КП(б)Б АБ ПАЛЯПШЭНЬНІ ГРАМАДЗКАГА ХАРЧАВАНЬНЯ

Як арганізаваць дастаўку гародніны на дом

РАБОЧЫЯ, УНОСЬЦЕ СВАЕ ПРАПАНОВЫ

ЗАБЫТЫЯ ПЛЯНЫ І ПРАЕКТЫ

Бюро ЦК КП(б)Б 23-га чэрвеня прапанавала Белкаапсаюзу і фракцыям гарсаветаў ужыць тэрміновыя меры да паляпшэньня грамадзкага харчаваньня. Белкаапсаюз павінен быў у першую чаргу пашырыць сталовыя і павялічыць іх прапускную здольнасьць, каб зьнішчыць, нарэшце, чаргі, пазбегчы палепшыць абслугоўваньне і патаніць кошт абедаў.

Здавалася-б, што гэтая дырэктыва партыі павінна была знайсьці належны адбітак у далейшай рабоце Белкаапсаюзу. Але што мы маем у сапраўднасьці? Ня гледзячы на тое, што з моманту апублікаваньня гэтай дырэктывы ўжо мінула паўтара месяца, Белкаапсаюз **нічога не зрабіў** для таго, каб правесьці яе ў жыцьцё.

Сэктар грамадзкага харчаваньня Белкаапсаюзу распрацаваў праекты арганізацыі 15 кухань-разьмеркавальнікаў, устанаўленьня абапемэнтнай сыстэмы ў сталовых і стварэньня спэцыяльнага фонду прадуктаў грамадзкага харчаваньня. Да сёнешняга дня **ўсе гэтыя праекты спакойна ляжаць у папках і праўленьнем Белкаапсаюзу не разгледжаны.**

Цэрабкопы ў сваёй рабоце не атрымліваюць належнага кіраўніцтва з боку Белкаапсаюзу, які фактычна плянецца ў хвасьце.

Для пашырэньня і паляпшэньня грамадзкага харчаваньня, вялікае значэньне мае арганізацыя сеткі **сталовак пры жактах.** Зараз толькі ў адным Менску мы маем 7 такіх сталовак з прапускной здольнасьцю 2.500 абедаў у дзень. Дзякуючы энэргічнай рабоце грамадзкасьці жактаў, гэтыя сталоўкі працуюць даволі добра. Але Белкаапсаюз і Менцэрабкоп, якія павінны быць зацікаўлены ў іх разгортваньні на кожным кроку **ставяць палкі ў колы.** Гэтыя сталоўкі арганізоўваліся стыхійна, без усякай дапамогі і кіраўніцтва з боку Белкаапсаюзу. Менскі ЦРК, які мае некаторую практыку ў арганізацыі грамадзкага харчаваньня, не аказвае ім тэхнічнай дапамогі. Пры забесьпячэньні гэтых сталовак прадуктамі МЦРК праяўляе агідную гандлярскую, дзяляцкую палітыку. Прадукты гэтым сталовым МЦРК адпускае не па сабекошту, а па продажнай цане. Гэта значыць з надбаўкамі для прыбытку. МЦРК лічыць сталовыя пры жактах «чужымі» і таму прадукты для іх не дастаўляюцца, работнікі жактаўскіх сталовак прымушаны стаяць цэлымі гадзінамі ў чарзе.

Як ідзе арганізацыя сталовых пры жактах у іншых рабочых цэнтрах БССР ні Белкаапсаюз, ні Белжылсаюз ня ведаюць. Гэтыя дзьве цэнтральныя арганізацыі нічога не зрабілі для пашырэньня грамадзкага харчаваньня і дапамогі ініцыятыве пайшчыкаў.

Брыгадзіры «Зьвязды»
М. Б. і А. Ч.

ЯК ЦРК ВЫКАНАЕ ВАШ ЗАКАЗ

Летась э-за нядбайнасьці праўленьня МЦРК была праваленая дастаўка гародніны на дом. Часткова былі вінаваты ў гэтым і прафсаюзныя арганізацыі, якія мала цікавіліся забесьпячэньнем рабочых.

У гэтым годзе ў сувязі з харчовымі цяжкасьцямі, якія мы зараз перажываем, АРГАНІЗАЦЫЯ ДАСТАЎКІ ГАРОДНІНЫ НА ДОМ набывае асабліва значэньне. Гэта дапаможа сваячасна забесьпечыць спажыўца гародніной і паспабіць крызіс з памяшканьнямі для хаваньня гародніны. У гэтым годзе МЦРК, улічыўшы свае памылкі, ужо зараз ПРЫСТУПАЕ ДА АРГАНІЗАЦЫІ ГЭТАЙ СПРАВЫ. Дастаўку прадуктаў на дом МЦРК мяркуе правесьці так.

Прыём заказаў будзе адбывацца ва ўсіх прадуктовых крамах і крамах па продажы гародніны. На найбольш буйных прадпрыемствы, у часе абедзеннага перапынку, работнікі бліжэйшых крам ЦРК таксама будуць прымаць заказы. Буйныя прадпрыемствы і ЖАКТ'ы змогуць падаваць калектыўныя заяўкі на дастаўку гародніны на дом. Аплата за гародніну і дастаўку будзе рабіцца пайшчыкамі пры атрыманьні заказаў. Пры гэтым пайшчыкам будзе выдавацца запіска з паказаньнем унесенай сумы.

Пры атрыманьні заказу кожны пайшчык будзе выдаваць возчыкам расьпіску ў атрыманьні, а таксама рабіць заўвагі аб якасьці атрыманых прадуктаў.

Ва ўсіх крамах, якія будуць рабіць папярэдні прыём заказаў, будуць вылучаны паасобныя работнікі. За якасьць прадуктаў будзе адказваць загадчык складу. Работа складу на гэты пэрыяд будзе пераведзена на дзьве зьмены, а транспарт на паўтары зьмены.

ЗАКАЗЫ ПАВІННЫ БУДУЦЬ ВЫКОНВАЦЦА НА ПРАЦЯГУ 10 ДЗЁН. На возчыкаў будзе ўскладзены абавязак, як правіла, складваць гародніну паводле паказаньняў заказчыка.

Каб папярэдзіць прастоі возчыкаў склады павінны быць забесьпечаны патрэбнай колькасьцю работнікаў. Для тэй групы работнікаў, ад якой будзе залежыць хуткая работа транспарту, будзе ўведзена папудная аплата.

З прычыны недахвату мяхоў, усім крамам трэба зьвярнуць увагу на тое, каб пайшчыкі пры заказах давалі сваю тару. На складзе гародніна павінна зандзя разважвацца—бульба па 50 кілё ў мяху, буракі па 20 і г. д.

Пайшчыкі з свайго боку, даўшы заказ, павінны прыняць яго ў вызначаны тэрмін.

Зьмяшчаючы гэты прыкладны парадак разьмеркаваньня і дастаўкі гародніны на дом, які вызначыла праўленьне МЦРК, мы зварачаемся да рабочых і служачых усіх менскіх прадпрыемстваў і ўстаноў з просьбай зрабіць свае заўвагі наконт мэтазгоднасьці гэтага мерапрыемства, унесьці свае прапановы і папраўкі. Мы чакаем тэрміновых карэспандэнцый на гэтую тэму ад рабочых актывістых і ўдарнікаў Прафарганізацыі ў першую чаргу па вінны сказаць сваё слова.

Чаму на кухні засталіся толькі першыя стравы

„Налёт" на сталоўку № 10

10-га жніўня, рэдакцыя шматтыражкі «Чырвоны Молат» (орган рабочых і служачых заводу «Энэргія») супольна з членам каапэрацыйнай камісіі зрабілі «налёт» на сталовую № 10, якая абслугоўвае завод «Энэргію».

Чым быў выкліканы налёт? У 2 гадз. 40 хв. каса сталоўкі спыніла выдачу другой стравы, заявіўшы, што «на кухні засталіся толькі першыя стравы». Рэдкалегія парашыла праверыць гэта. І вось у часе налёту выявілася, што ў духоўцы былі схаваны 5 порцый добра смажанай на маргарыне рыбы ў той час, калі для рабочых смажыцца на алеі, 2 порцыі рысавай кашы, з якіх адна з паліўкай, якой рабочыя не атрымліваюць, і гаршчок з маслам. На запытаньне — каму гэта пакінута, ніхто не адказаў. — Ня ведаем, — вось быў адказ работнікаў кухні.

Трэба дадаць, што МЦРК нядаўна выдаў катэгарычны загад, каб работнікі сталовак не бралі абедаў дамоў, але, як відаць, гэты загад ня выконваецца.

Выяўлена, што з 8 жніўня пад расклядкай прадуктаў, якія ідуць у кацёл няма подпісу. З 9-га жніўня засталося 100 порцый смажанага мяса, якое ў той дзень фактычна не выдавалася. У буфэце прадукты хаваюцца ў антысанітарных умовах. За выдачай такіх прадуктаў як сыр, вэндліна няма ніякага кантролю. Бывалі выпадкі, калі ў рабочых адрывалі талёны на гэтыя прадукты, а давалі ім толькі абаранкі і чай.

Ні заўком, ні каапкамісія заводу нічога ня робяць для паляпшэньня работы буфэту і сталовай. З прычыны дрэннай работы абслугоўваючага пэрсаналу і недахвату апошняга ў буфэце і сталоўцы часта ствараюцца чаргі. Рабочыя з-за гэтага спазьняюцца на работу.

Мы лічым, што трэба паставіць на чале буфэту і сталовай рабочых пашага заводу. Мы патрабуем безадкладнай рэвізіі сталовай № 10. Агітпасьці з абслугоўваньнем рабочых павінны быць ліквідаваны.

ПАЛІЧАНСКІ, ХАСКІН.

Бяспрытульная справа

Праўленьне МЦРК зварачае мала ўвагі на разьвіцьцё рыбнае справы. Склад, дзе хаваецца рыба зусім не прыстасаваны для гэтай мэты. З-за адсутнасьці транспарту рыба дастаўляецца ў крамы са спазьненьнем. Работнікі складу адсылаюць рыбу ў крамы не адсартаванай. Таму ва многіх крамах часта першы гатунак прадаюць за другі і наадварот. Спэцыяльных рыбных прадаўцоў у крамах няма. Праўленьне МЦРК не паклапацілася, каб падрыхтаваць адпаведных работнікаў. На праўленьні МЦРК ні разу ня быў заслуханы даклад загадчыка рыбнага складу. З прычыны таго, што на рыбным складзе няма тэлефону, загадчыкам рыбных крам часта зусім дарэмна прыходзіцца бегаць на склад.

У апараце ЦРК дагэтуль ня вызначаны спэцыяльны чалавек, які-б ведаў рыбнай спарвай, таму яна і знаходзіцца такім бяспрытульным становішчы.

Рабкор ЛІЎШЫЦ.

Тав. Васілевіч выступае з прамовай на адкрыцьці выстаўкі.

Арганізацыя работы гарсаветаў

Пастанова прэзыдыуму ЦВК СССР аб арганізацыі работы гарсаветаў у сувязі з ліквідацыяй акруг

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР ПАСТАНАЎЛЯЕ:

Ухваліць унесеныя Камісіяй Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР па ліквідацыі акруг прапановы аб рэарганізацыі работы гарадзкіх саветаў і ўстанавіць у разьвіцьцё асноўных палажэньняў аб арганізацыі ў Саюзе ССР гарадзкіх саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў (Збор. Зак. Саюзу ССР, 1928 г. № 10, ст. 86), наступны парадак работы гарадзкіх саветаў у сувязі з ліквідацыяй акруг:

1. У гарадох з насельніцтвам да 50 тыс. жыхароў гарадзкія саветы арганізуюцца і дзейнічаюць у адпаведнасьць з асноўнымі палажэньнямі аб арганізацыі ў Саюзе ССР гарадзкіх саветаў і падпарадкоўцца адпаведнаму раённаму выканаўчаму камітэту.

2. Гарады з насельніцтвам звыш 50 тыс. жыхароў, якія маюць буйное прамысловае значэньне і зьяўляюцца культурна-палітычнымі цэнтрамі, выпучаюцца ў самастойныя адміністрацыйна-гаспадарчыя адзінкі. Гарадзкія саветы гэтых гарадоў непасрэдна падпарадкоўцца прэзыдыумам цэнтральных выканаўчых камітэтаў саюзных ці аўтаномных рэспублік ці адпаведным краявым (абласным) выканаўчым камітэтам па прыналежнасьці.

Паводле пастаноў цэнтральных выканаўчых камітэтаў саюзных рэспублік у самастойныя адміністрацыйна-гаспадарчыя адзінкі могуць быць выпучаны гарады з насельніцтвам менш за 50 тысяч жыхароў, калі гэтыя гарады маюць буйное прамысловае і культурна-палітычнае значэньне.

3. Да гарадоў, якія выпучаюцца ў самастойныя адміністрацыйна-гаспадарчыя адзінкі (арт. 2), дапучаюцца наўкольныя сельскія мясцовасьці ў межах ня больш аднаго раёну да кожнага гораду. Сельскае насельніцтва гэтых мясцовасьцяй, ствараючы сельскія саветы на аснове існуючых аб іх законах, удзельнічаюць у выбарах гарадзкіх саветаў на агульных падставах, устаноўленых для выбараў у гарадзкія саветы. Парадак далучэньня да гарадоў сельскіх мясцовасьцяй вызначаецца цэнтральнымі выканаўчымі камітэтамі саюзных рэспублік.

4. Кіраўнічыя і выканаўчыя органы гарадзкіх саветаў ствараюцца і дзейнічаюць у адпаведнасьці з арт. арт. 23, 24, 26, 27 і 28 асноўных палажэньняў аб арганізацыі ў Саюзе ССР гарадзкіх саветаў.

Ніякіх іншых выканаўчых органаў (гарадзкіх, раённых выканаўчых камітэтаў і г. д.) у сувязі з далучэньнем да гарадоў сельскіх мясцовасьцяй (арт. 3) не ствараецца.

Для кіраўніцтва паасобнымі галінамі кіраваньня гарадзкія саветы ствараюць свой самастойны апарат. Структура і штаты апарату гарадзкіх саветаў вызначаюцца заканадаўствам саюзных рэспублік.

5. З прычыны таго, што цэлы рад гарадзкіх сацыяльна-культурных устаноў разьлічаны на абслугоўваньне ня толькі гарадзкога, але і сельскага насельніцтва, запрапанаваць цэнтральным выканаўчым камітэтам саюзных рэспублік даць паказаньні гарадзкім саветам аб парадку абслугоўваньня імі сацыяльна-культурных патрэб бліжэйшага да гарадоў сельскага насельніцтва.

У мэтах узмацненьня работы гарадзкіх саветаў на вёсцы гарадзкія саветы ствараюць сэкцыі па работе на вёсцы.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР
М. КАЛІНІН.
Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР
А. ЕНУКІДЗЕ.
Масква, Крэмль, 9 жніўня 1930 г.

Спыніць зьдзекі

Вось ужо два з паловай месяцы, як рабочыя і служачыя, якія адпачываюць у раёне дачнай мясцовасьці Дразды, выносяць нячуваныя зьдзекі з боку транспартнага трэсту, на абавязку якога ляжыць абслугоўваньне прыгараднага руху. Усяго толькі два разы ў дзень павінны аўтабусы транспартнага трэсту курсаваць на лініі Менск—Дразды: раніцай а 8 і ўвечары а 5 гадзіне. Але гэты тэрмін захоўваецца толькі ў выключных выпадках. Як правіла, аўтамашыны адходзяць са значным спазьненьнем, або зусім ня прыходзяць.

Амаль кожны дзень пачынаецца адна і тая-ж гісторыя. Рабочыя і служачыя да 5 гадз. пачынаюць збірацца на Пляцы Волі. Першае пытаньне — «ці прыдзе аўтабус?» — «Абяцалі роўна а пятай» — адказваюць «добраахвотнікі», якія ўжо пасьпелі пазваніць па тэлефоне ў гараж або трэст і агрымалі запэўненьне, што машына будзе.

Пасажыры цярпліва чакаюць. Гадзіньнік б'е пяць, аўтабусу няма. Праходзіць яшчэ 10 хвілін — аўтабусу няма. «Добраахвотнікі» накіроўваюцца званіць у гараж. Адтуль адказваюць: «Машына хутка будзе». Пасажыры чакаюць яшчэ 10 хвілін — машыны няма. Зноў званкі ў гараж і зноў такі-ж адказ — «хутка будзе». Гадзіньнік б'е 5.30. Аўтабусу няма... Званкі а большымі або меншымі перапынкамі працягваюцца, а з гаражу ўсё заспакойваюць: «Чакайце, зараз прыедзем».

«Добра», калі машына спозьніцца на гадзіну, часта яна спазьняецца на 1½ гадзіны і больш. Гэты час 30-40 пасажыраў чакаюць тут у Менску, 20-30 — чакаюць у Дразах, працячы пяршлівасьць і праклінаючы трэстаўскія «парадкі».

Яшчэ горшы ўплыў робіць на пасажыраў раніпняе спазьненьне. Служачыя павінны прыходзіць на работу а 9 гадз. раніцы, а транспартрэст высылае аўтабус ня ў 8, а ў 9 гадзін, 9.30, або зусім ня прысылае. Можна сабе лёгка ўявіць настрой рабочых і служачых, якім пасьля гадзіны дарэмнага чаканьня прыходзіцца накіравацца ў горад пеша. Урэшце «плачуць казённыя грошы», бо спазьненьне на работу з прычыны спазьненьня аўтабусу—прычына «грунтоўная».

Апрача таго, нерэгулярны рух б'е таксама па кішэні самога транспартнага трэсту, бо частка пасажыраў, не дажываючы больш аўтабусу, наймаюць рамізьнікаў.

Пяжка было-б прад'явіць прэтэнзію транспартнаму трэсту, калі ён зусім адмовіўся абслугоўваць дачнікаў. Тады кожны шукаў-бы іншага выхаду. Але становішча ўскладняецца тым, што трэст ад рэйсаў у Дразды не адмаўляецца, але і ня хоча навесьці парадку.

Час ужо спыніць зьдзекі над пасажырамі.

АДЗІН З МНОГІХ.

Менскія школы не падрыхтаваны да навучальнага году

У мінулым годзе ў Менску абавязковым пачатковым навучаньнем было ахоплена 95 проц. дзяцей. У гэтым годзе пры кожнай працоўнай школе ствараюцца спэцыяльныя камісіі, якія будуць весьці работу з дзяцьмі, што не прайшлі яшчэ агульнага абавязковага навучаньня. У Менску ёсьць больш 5.000 бядняцкіх дзяцей, якіх трэба забясьпечыць гэтым хоць-бы мінімальнай колькасьцю прадуктаў. Калі па гэта свячасова не будзе зьвернута ўвага, агульнае навучаньне дзяцей беднаты будзе сарвана.

49 школьных груп Менску дагэтуль ня маюць памяшканьняў для заняткаў. Менскія працоўныя школы сустракаюць новы навучальны год бяз усякіх праграм і падручнікаў.

За дзень

— 9 жніўня рабочыя менскай абутковай фабрыкі, гарбарні «Бальшавік» і шчотачнай фабрыкі выехалі ў свае падшэфныя раёны (Койданаўскі і Самахвалавіцкі), каб у свой выхадны дзень дапамагчы калгасам убраць збожжа.

— Гэтымі днямі па саюзе гарбароў была склікана нарада прадстаўнікоў трэстаў і дырэктараў менскіх прадпрыемстваў па пытаньні аб дапамозе Менскай, Гомельскай і Віцебскай фабрыкам скласьці «сустрэчны прамфінплян». Прадстаўнікі трэстаў выехалі на месцы.

— ЦП саюзу будаўнікоў адкрывае курсы дзесятнікаў - будаўнікоў на 120 чалавек.

— Прэзыдыум Менгарсавету пастанавіў вызначыць вучастак па Універсытэцкай вул. (супроць клюбу мэталістых) для пабудовы тэатру ў Менску.

— Прэзыдыум Менгарсавету вызначыў у кантрольных лічбах па камунальных работах на 1930-31 г. узмацненьне берагоў ракі Сьвіслачы і пабудову жалезна-бэтоннага маста на Ляхаўцы.

— Заняткі ў 7-мігодках Менску пачнуцца 1 верасьня. Прыём заяў з 15 па 25 жніўня.

Правілы прыёму

ў Менскі Вячэрні Рабочы Універсытэт на 1930-31 навучальны год

1. У Менскі Вячэрні Рабочы Універсытэт прымаюцца рабочыя з 3-гадовым вытворчым стажам, ва ўзросьце з 18 да 40 г. і адукацыяй ня ніжэй 4-годкі.

2. Вячэрні Рабочы Універсытэт падзяляецца на 2 факультэты: а) грамадзка-эканамічны з аддзяленьнямі: адміністрацыйна - гаспадарчым, прафесыйным і канцэрацыйным, б) тэхнічны з аддзяленьнямі мэханічным, электрычным і хімічным. На грамадзка - эканамічны факультэт прымаюцца 100 асоб, а на тэхнічны 200 асоб.

3. Да заявы аб паступленьні ў ВРУ прыкладваюцца наступныя дакументы: а) анкета, заверaная ФЗМК, б) даведка аб узросьце, в) даведка аб адукацыі, г) даведка аб вытворчым стажы.

Увага: асобы, якія ня маюць пасьведчаньня аб скончэньні 4-годкі, трымаюць іспыты ў гэтым аб'ёме.

Прыём заяў праводзіцца з 10 па 31 жніўня штодзённа з 6 да 9 гадз. веч. у канцылярыі вяч. раб. ун-ту (Земляробскі зав. № 4, фізычны інстытут БДУ).

Дырэктар Вяч. Раб. Ун-ту
ГОЛІКАЎ.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

— **Культпроп Фрунзаўскага РК КП(б)Б** паведамляе ўсе парт'ячэйкі, што 11-га жніўня а 7 гадз. увечары ў памяшканьні Дому Камасьветы (чытальня, 2-гі паверх) склікаецца капсультацыя па пытаньні ўкамплектаваньня партсеткі на 1930-31 г. Павінны абавязкова зьявіцца кіраўнікі сэктараў нарасьветы ячэек.

— **Клюб СГС.** 14 жніўня для членаў саюзу саўгандальслужачых арганізоўваецца вечар, прысьвечаны 10-ці годзьдзю прафруху і V Кангрэсу Прафінтэрну. Пачатак роўна а 9 г. веч. Пасьля дакладу — мастацкая частка.

— **Дом Асьветы.** 17 жніўня а 4 гадз. дня ў клюбе працасьветы адбудзецца агульна-гарадзкая нарада сакратароў ячэек «П. Н.», ліквідатараў няпісьменнасьці і арганізатараў - мэтадыстых. Яўка абавязкова.

Мен. АБ ДКА ЛКСМБ сумесна з рэдакцыяй «Піянэр Беларусі» склікае нараду прадстаўнікоў гар. АНА Беларускага выдавецтва, МЦРК, Белкаапсаюзу, сумесна з працаўніком ЦКК-РСІ па пытаньні падрыхтоўкі да навучальнага году.

На нараду запрашаюцца загадчыкі школ г. Менску, настаўніцтва і піянэрпрацаўнікі.

Нарада адбудзецца 14-га жніўня роўна а 10 гад. раніцы ў памяшканьні АК ЛКСМБ (Энгельса 26).

„Зьвязду"—у масы

Вылучыць упаўнаважаных па распаўсюджваньні „Зьвязды"

Зрабіць рашучы зрух у справе павялічэньня падпіскі

У кастрычніку мінулага году ЦК КП(б)Б даў дырэктыву аб вылучэньні ў райкомах і партыйных ячэйках упаўнаважаных па распаўсюджаньні «Зьвязды».

Частка партыйных ячэек аднеслася да гэтага пытаньня з усёй сур'ёзнасьцю. Пашырэньне цэнтральнага органу стала часткай работы гэтых ячэек. Вылучаны ўпаўнаважаныя з больш актыўных таварышоў, якія цікавяцца справай пашырэньня друку. Ячэйка кіруе і дапамагае ім у работе. У такіх ячэйках справа па пашырэньні «Зьвязды» пастаўлена добра.

Але побач з гэтым, значная частка ячэек аднеслася да дырэктывы фармальна. Работа па распаўсюджваньні «Зьвязды» даручана агульнаму зьбіральніку падпіскі. Кіраўніцтва і дапамога з боку ячэек адсутнічае.

У паасобных ячэйках упаўнаважаныя зусім ня вылучаны. Работа па пашырэньні «Зьвязды» не праводзіцца. Ячэйка не цікавіцца тым, што чытаюць партыйцы. Калі агульная сума падпіскі павялічэньне, гэтым ячэйка ня цікавіцца.

Зараз, калі роля і значэньне друку, у прыватнасьці «Зьвязды» — калектыўнага арганізатара і прапагандыстага, значна ўзрастае, райкомы і партыйныя ячэйкі павінны зрабіць рашучы зрух у справе павялічэньня падпіскі на «Зьвязду» — шырока разгарнуць і ўзмацніць работу, зрабіць яе масавай і палепшыць яе якасьць. У тых ячэйках, дзе ўпаўнаважаныя яшчэ ня вылучаны, зараз-жа вылучыць. Кіраваць і штодзённа дапамагаць у рабоце ўпаўнаважаных, даць ім матчымасьць, як належыць, заняцца пытаньнем пашырэньня друку, пэрыядычна заслухоўваць справаздачы на бюро ячэек і партсходах—гэта павінна ўвайсьці ў сыстэму работы ячэек.

Толькі пры гэтых умовах, толькі пры стварэньні моцнага і працаздольнага інстытуту ўпаўнаважаных, будзе забясьпечана пасьпяховае пашырэньне «Зьвязды».

Рыхтуйцеся да ўдарнай асеньняй работы

Набліжаецца вельмі важная, у справе пашырэньня друку, асеньняя кампанія. З прычыны водпускаў і паслабленьня работы (летам), падпіска на «Зьвязду», як і на іншыя выданьні, зьменшылася.

Галоўнай задачай асеньняй кампаніі зьяўляецца — адмавіць страчаны ім чытачоў і пасунуць справу павялічэньня падпіскі. Пачаць работу трэба зараз-жа.

Масавая работа, якая летам заціхла, павінна быць адноўлена, значна пашырана і ўзмоцнена. Стварэньне гурткоў чытачоў, прапрацоўка матар'ялаў і чыткі асобных артыкулаў з газэты, гутаркі індывідуальныя і групавыя—вось што павінна ўвайсьці ў кола дзейнасьці ўпаўнаважанага. Шырока павінна быць разгорнута спаборніцтва паміж цэхамі і аддзеламі.

Праводзячы работу па пашырэньні «Зьвязды» сярод партыйных мас, упаўнаважанаму трэба не забываць і аб беспартыйным актыве.

Час. вып. абав. адказ. рэдактара
А. МІТЛІН.

У сераду, 13 жніўня, а 5 гадз. вач. у памяшк. ЦК МОПР'у

АДБУДЗЕЦЦА

аб'яднанае пасяджэньне прэзыдыуму ЦК МОПР'у, Мен. АК МОПР'у, Фрунзаўск. і Кастрычніцкага РК МОПР'у.

Парадак дня: 1. Плян работы ЦК МОПР'у, 2. Ліквідацыя акругкомаў. 3. Бягучыя справы.

Усім членам ЦК МОПР'у, Мен АК МОПР'у, райкому МОПР'у, якія знаходзяцца ў Менску, зьявіцца без спазьненьня ў абавязковым парадку.

Сакратар ЦК МОПР'у КАЛМЫК.

ПАЧАЛАСЯ ЧЫСТКА АПАРАТУ

Менскай паштова-тэлеграфнай канторы і чыгуначнага аддзяленьня сувязі.

Просьба да ўсіх грамадзян прысылаць (бяз марак) матар'яп аб недахопах працы пошты і асобных супрацоўнікаў.

Камісія па чыстцы.

Аўторак 12, Серада 13, Чацьвер 14 і Пятніца 15 ЖНІЎНЯ

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР

„РАЗЛОМ" п'еса Б. Лаўрэнэў. у 4-х дзеях

Пастаноўка С. Розанава. Мастак Ю. Гольц. Музыка Л. Палавінкіна. Дырыжэр І. Гінтарц. Памрэж. С. Калпашнікаў.—(Пачатак а 8 з пал. г.) Білеты прад. у касе тэатру, у раб. касе і на выстаўцы.

Кіно-тэатр „Культура"

Гістарычны мастацкі фільм паводле аповесьці Лермантава

Каўкаскі нявольнік кіно-паэма ў 6 част.

Пачатак роўна а 7 г. Каса—ад 5 гадз. УВАГА: пры калектыўным наведваньні кіно «Культура» скідка на ўсе білеты 25 проц.

КІНО Інтэрнацыянал

Новая вясёлая камэдыя

22 няшчасьці

Зьвыш праграмы—цікавы культфільм. МАРЫЙЦЫ

Вытворчасьці «Усход-кіно».

Пачатак а 7 гадз. Каса—ад 5 гадз.

КІНО „Пралетары"

Выключны мастацкі фільм

САЛАМБА Гістарычная драма ў 7 частках

У галоўн. ролях: Жана дэ-Бальзак, Рольна Норман, Віктар Віна, Рафаэль, Левін, Анры Бадэн.

Пачатак сэансаў: 7 г., 8 г. 30 м., Каса—ад 5 г.

КІНО-Сад

Вясёлая камэдыя ў 8 частках

НА 7-М НЕБЕ

У галоўн. ролях: Выдатныя кіно-артыстыя Гарольд Лойд і Мільдрэд Дэвіс.

Пачатак роўна а 10 гадз. Каса—ад 6 г. Толькі 2 сэансы ў вечар.

КІНО „СПАРТАК"

Выдатны фільм

ДЗІНА-ДЗАДЗУ драма ў 7 част.

Сёньня 3 сэансы: 1-шы—7 г., 2-гі—9 г., 3-ці—10 45 г. КАСА—ад 6 гадз.

ЦЫРК

Пад кіраўніцтвам І. Л. СТРАШЭВІЧА.

У аўторак, 12-га жніўня

ВЫДАТНАЕ ЗРЭЛІШЧА

ў 3-х аддзяленьнях

Дэбют паветранага гімнаста Костанцо.
Дэбют Надзіі гімнасты над купалам цырку.
Новы жанр Біль-Кудо музычныя сатырыкі.
Выступленьне адноўленым рэпэртуарам Б. ТАМАРЫНА.

Непараўнальныя каўкаскія наезьнікі джыгіты

4 — ТАГАНАВЫ — 4

Спарт. акт. на турніках РЫЗЕНБЕРГА | і ўвесь іншы персанал.
Пачатак а 8 гадз. 30 м. Адказны кіраўнік СТРАШЭВІЧ.

Кіно-сад

Ад аўторка, 12 жніўня

ВЯСЁЛАЯ КАМЭДЫЯ Ў 8 ЧАСТКАХ

НА 7-М НЕБЕ

У галоўн. ролях: Выдатныя кіно-артыстыя Гарольд Лойд і Мільдрэд Дэвіс.

Пачатак роўна а 10 г. Каса—ад 6 г. Толькі 2 сэансы ў вечар.

ГОСТЕХИЗДАТ

СТРОИТЕЛЬ

ВЫХОДИТ ДВА РАЗА В МЕСЯЦ

Популярный журнал по технике строительства, назначенный для среднего техперсонала и квалифицированных рабочих.

1. Жилищное строительство. 2. Дорожное и жел.-дорожное строительство. 3. Сельское огнестойкое строительство. 4. Вопросы рационализации. 5. Рабочее изобретательство. 6. Письма техкоров. 7. Теория—основа практики. 8. Вопросы и ответы. 9. Что писать? 10. Справочный отдел.

Подписка принимается с апреля (с № 7)

Подписная плата: 9 мес.—3 руб., 6 м.—2 р. 25 к., 3 м.—1 р. 20 к.
При коллективной подписке: 9 мес.—2 р. 55 к.

СТРОИТЕЛЬНАЯ ПРОМЫШЛЕННОСТЬ

Ежемесячный журнал, всесторонне освещающий вопросы строительства.

1. Строительные материалы: цемент, кирпич, дерево, железо и др. 2. Капитальное строительство (дорожное, водное, мостовое, железнодорожное, военное). 3. Жилищное и промышленное строительство. 4. Сельско-хозяйствен. строительство. 5. Машина в строительном деле. 6. Новости строительства за границей. 7. Производственный отдел. 8. Наука и Техника. 9. Вопросы нормирования и стандартизации. 10. Экономика строительства. 11. Строительство и право.

Подписка принимается с апреля (с № 4)

Подписная плата: 9 мес.—8 р. 25 к. 6 мес.—6 р. 75 к., 3 мес.—3 р. 75 к.
При коллективной подписке: 9 мес.—7 р.

ПОДПИСКА ПРИНИМАЕТСЯ: в Гостехиздате—Москва, ГСП, 2, Ильинка проезд Владимирова, 4, в отделениях и магазинах издательства, на почте, у письмоносцев

Згубленыя і ўкрадзеныя дакументы

лічыць несапраўднымі:

Чл. біл. саюзу СГС № 7338, пасьведч. № 1140, выд. Белаўтакіраўніцтвам на імя Хамянюка В. О. 1751-1752
Мэтр. вып. Бажок П. А., выд. Смелавіц. РВК. 1753
Бірж. карт. Савіча І. П., выд. Мен. бірж. працы. 1754
Кн. на кармл. дзіцяці, выд. Мен. касай, на імя Рэнкляра Э. Ф. 1755
Мэтр. вып. Рэнкляр Р. Э., выд. Мен. ЗАГС'ам. 1756
Каапэр. кн. Хазанава М. М., выд. Гарадокск. спажы. т-вам. 1757
Вайск. біл. Чулец С. І., выд. 40 кав. полк. 1758
Парт. біл. № 1025534 Лаўжыкас Ф. П., выд. Омск. АК УсеКП(б). 1759
Мэтр. даведка Гладкова Р. М., выд. Труханаўск. с.-с. 1760
Пашп. Якавіцкай А. А., выд. Мен. міліцыяй. 1761
Студ. пасьведч. Біч М. Г., выд. БДУ. 1767
Чл. біл. саюзу працасьветы № 7422 Ліскова М. Ц. 1768
Пасьведч. Мятліцкай В. А., выд. Мен. курсамі ЦПП. 1769
Вайск. біл., выд. Вузьденск. РВК, пашп., выд. Вузьденск. міліцыяй на імя Столяра Л. Х. 1770-1771
Вайск. біл. Этуса І. І., выд. Мен. ваенкаматам. 1772
Вайск. кн. Дзямідава А. Я., выд. б. Глуск. ВВК. 1773
Пашп. Місюк Н. П., выд. Мен. міліцыяй. 1774
Мэтр. вып. Місюк Г. Ф., выд. Мен. ЗАГС'ам. 1775
Мэтр. вып. Місюка Г. Ф., выд. Мен. ЗАГС'ам. 1776

Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва.

ВЫШЛА З ДРУКУ І ПРАДАЕЦЦА:

Праф. В. В. Вінэр: ПАЛЯВОДЗТВА БССР НА ВЫСТАЎЦЫ.

Стар. 36, цана 15 кап.

ДЫРЭКЦЫЯ

1-й Усебеларускай Выстаўкі Сельскай Гаспадаркі і Прамысловасьці

АБВЯШЧАЕ, што ўваход на выстаўку з партфэлямі, карзінкамі і г. д.

ЗАБАРОНЕНЫ

дырэкцыя.

Згодна пастановы калегіі НКА Беп.

3-ці канцэнтр школы імя Чарвякова (Савецкая, 44) з хімічным ухілам (8 і 9 групы)

рэарганізаваны ў хімічную прафшколу.

З 11 па 30 жніўня праводзіцца прыём заяў на першы курс. Умовы прыёму, як і ва ўсе іншыя прафшколы на базе 7-годкі. Адначасова, з 15 па 25 жніўня праводзіцца перарэгістрацыя ўсіх вучняў школы.

Адміністрацыя школы.

АБ'ЯДНАНАЯ ПРАФТЭХШКОЛА

г. КЛІМАВІЧЫ

на базе 7-годкі, абвяшчае ПРЫЁМ на 1-ыя курсы мэталістых і дрэваапрацоўшчыкаў.

Прыём, згодна даведніку НКАсьветы на 1930-31 навуч. год.

Заявы прымаюцца да 25 жніўня па адрасе: г. Клімавічы, БССР, прыймовая камісія аб'яднанай прафтэхшколы.

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА

Падручнікі і навучальныя дапаможнікі

на 1930-31 навучальны год

Вышлі з друку і прадаюцца ва ўсіх кнігарнях БДВ і спажыўкаапэрацыі

Падручнікі для малапісьменных:

1. ВІНАГРАДАЎ і СЕЎРУК.—НАША КАМУНА—лемантар для калгасьнікаў і сельгаслесарабочых, выд. 1930 г. Стар. 250. Цана 70 кап.
2. МАКЛЮК і ПРУДНІК.—ЛЕМАНТАР ДЛЯ ГАРАДЗКІХ ШКОЛ ГРАМАТЫ, выд. 1930 год. Стар. 220. Цана 60 кап.

Падручнікі для 1 канцэнтру:

1. РАЗРАЗНАЯ АЗБУКА, выд. 1930 г. Цана 15 кап.
2. МЯШАЛКІНА і СІЎКО.—ЧЫРВОНЫЯ ЗОРКІ—лемантар для вёскі, выд. II, папраўленае, выд. 1930 г. Стар. 148. Цана 45 кап.
3. ПІГУЛЕЎСКІ.—ЧЫРВОНЫЯ ЎСХОДЫ — кніжка для чытаньня і работы ў 1-й групе, ч. I, выд II папраўленае і дапоўненае, выд. 1930 г. Стар. 224. Цана 60 кап.
4. ПІГУЛЕЎСКІ.—ЧЫРВОНЫЯ ЎСХОДЫ — кніжка для чытаньня і работы ў 1 групе, ч. II, выд. 1929 г. Стар. 302. Цана 80 кап.
5. САГАЛОВІЧ.—СШЫТАК МАТЭМАТЫЧНЫХ ПРАЦ, ч. I, выд. 1929 г. Стар. 52. Цана 20 кап.
6. САГАЛОВІЧ.—СШЫТАК МАТЭМАТЫЧНЫХ ПРАЦ, ч. II, выд. 1929 г. Стар. 52. Цана 20 кап.
7. САГАЛОВІЧ.—СШЫТАК МАТЭМАТЫЧНЫХ ПРАЦ, ч. III, выд. 1929 г. Стар. 58. Цана 20 кап.
8. ЛОЙКА.—НАШ КАЛГАС—рабочая кніга па матэматыцы, ч. I, выд. 1930 г. Стар. 240. Цана 80 кап.
9. ГАРБАЦЭВІЧ.—РАБОЧАЯ КНІГА ПА МОВЕ для IV году навучаньня, выд. 1930 г. Стар. 175. Цана 50 кап.

Падручнікі для II канцэнтру:

1. ЧУДОВІЧ і ДРУЖЫЛОЎСКАЯ.—ФАРМАЛЬНЫ СЫНТАКС, выд. 1930 г. Стар. 156. Цана 70 кап.
2. ПЭЦОЛЬД і ЗАЛЕСКАЯ.—РАБОЧАЯ КНІГА ПА НЯМЕЦКАЙ МОВЕ, выд. 1930 г. Стар. 328. Цана 1 р. 60 к.
3. КАСМОВІЧ. — ГЕАГРАФІЯ ПА-ЗА-ЭЎРАПЭЙСКІХ КРАІН, выд. 1930 г. Стар. 232. Цана 1 р. 80 к.
4. КАСАБУЦКІ.—РАБОЧАЯ КНІГА ПА МАТЭМАТЫЦЫ, VI год навучаньня, выд. 1930 г. Стар. 194. Цана 1 р. 60 к.
5. ПРАЕКТ ПРАГРАМЫ І МЭТАДЫЧНЫЯ ЗАПІСКІ ПА ФІЗЫКА-ТЭХНІЦЫ І МАТЭМАТЫЦЫ для II канцэнтру сямігадовае савецкае політэхнічнае школы, выд. 1930 г. Стар. 24. Цана 48 к.

Гомельскі АГРАПЭДАГАГІЧНЫ інстытут

абвяшчае, што прыём заяў для паступленьня ў інстытут працягнут да 10 верасьня. З 10 па 20 верасьня адбудуцца прыймовыя іспыты.

Ад іспытаў вызваляюцца: скончыўшыя рабфакі, пэдтэхнікумы (пасьля 3-хгад. ст. падгат.), курсы для паступл. ВНУ, прафшколы, на базе 7-годкі і фабзавучы, скончыўшыя 9-годкі, агульна-адукац. курсы, 2-гад. пэд. курсы (пасьля 2-гад. стажу) і вячэрнія школы ўзвыш. тыпу.

Вызваляюцца ад усіх іспытаў, акрамя прыродазнаўства, скончыўшыя былыя наст. інстытуты, наст. сэмінарыі, гімназіі, рэальныя вучылішчы, камэрцыйныя.

Скончыўшыя ўсе іншыя навуч. установы трымаюць іспыты на вызнач. у даведчыку праграмам.

Аграпэдінстытут мае два аддзелы: 1) фізыка-тэхнічны, 2) прыродазнаўчы.

Інстытут рыхтуе выкладчыкаў для 7-годак калгаснай моладзі.

Студэнты будуць забясьпечаны інтэрн. і большасьць стыпэндыямі.

Заняткі пачнуцца 1-га кастрычніка.

Дырэктар Пэдінстытуту ЕРМАКОЎ.

Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва

Вышлі з друку і прадаюцца ва ўсіх кнігарнях БДВ і спажыўкаапэрацыі.

Сельска-гаспадарчая бібліятэка.

В. Чэмелаў.—Канюшына на насеньне. Стар. 47. Цана 15 кап.

Г. Захарэнка.—Машына-конныя і трактарныя станцыі ў БССР. Стар. 51. Цана 7 кап.

А. Дзямідовіч.—Пустазельле на нашых палетках і спосабы змаганьня з ім. Стар. 51. Цана 25 кап.

15 ліпеня знойдзены грошы у сталоўцы МЦРК № 3.

За атрыманьнем зьвярнуцца да загад. сталоўкі не пазьней 20 жніўня.

10 жніўня на стадыёне (Менск) згублен або ўкрадзен кошалёк з грашыма і пярсьцёнак, а таксама дакумент—выпіска з пратаколу аб прахадзенай чыстцы сан. апарату на імя Сьмятаньнікава Н. К. Знайшоўшага просьба зьвярнуць за ўзнагароду па адрасе: Лекерта, 15, Цэнтрасьпірт, т. Сьмятаньнікаву.

НАРКАМАСЬВЕТЫ

даводзіць да ведама слухачоў, якія скончылі кароткатэрміновыя курсы па падрыхтоўцы ў тэхнікумы, ВНУ і ВТНУ,

што апошні тэрмін да якога кожны слухач павінен падаць усе неабходныя ДАКУМАНТЫ Ў НАВУЧАЛЬНЫЯ ЎСТАНОВЫ,

ПРАЦЯГНУТ ДА 25 ЖНІЎНЯ.

Пасьля гэтага тэрміну ніякія заявы навучальнымі ўстановамі прымацца ня будуць.

Член калегіі НКАсьветы МАЗУР.

Для Менскай лямцава-вяровачнай фабрыкі «ЧЫРВОНЫ КАСТРЫЧНІК»

ПАТРАБУЕЦЦА ТЭХНІК,

які знаёмы з канструкцыяй валяльных і прадзільных машын.

АПЛАТА па ЗГОДЗЕ

З прапановай зьвярнуцца па адрасе: г. Менск, Мала-Татарская, 61, тэл. № 7-40. Дырэкцыя фабрыкі.

Да ведама хатніх працаўніц.

14 жніўня а 7 гадз. веч. у садзе нархаза адбудзецца

АГУЛЬНЫ СХОД РАБОТНІЦ ўсіх трох мясцкомаў

З прычыны важнасьці пытаньня яўка ўсіх работніц абавязкова. У выпадку дрэннага надвор'я сход пераносіцца ў клюб.

Для здачы ПАВЕСТКІ у газэту „ЗЬВЯЗДА" званецца па тэл. 7-81

50 к. плацы публіцыі аб згубе дакументу

Друкарня газ. «Зьвязда», Менск. Менск. Галоўлітбел 337